У БЕЛАРУСІ З'ЯЎЛЯЮЦЦА НОВЫЯ ТУРЫСТЫЧНЫЯ МЯСЦІНЫ



ВАДА БЕЗ ЖАЛЕЗА І ПРЫМЕСЯЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 СНЕЖНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 245 (29112)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Ідэя інтэграцыі інтэграцый, або кааперацыі інтэграцый, заключаецца ў тым, каб надаць збліжэнню ЕС і ЕАЭС комплексны і спарадкаваны характар з прыцэлам на канкрэтныя матэрыяльныя перавагі для абодвух саюзаў. Такое збліжэнне дазволіла б умацаваць давер і развянчаць міф пра несумяшчальнасць і суперніцтва ўсходняй і заходняй сістэм. Менавіта з-за гэтага міфа краіны аказваюцца перад ілжывым выбарам паміж Захадам і Усходам на шкоду адносінам з тым ці іншым са сваіх партнёраў. Між тым у рэальнасці такога выбару не павінна быць у прынцыпе, і партнёрства двух інтэграцыйных аб'яднанняў павінна гэта пераканаўча прадэманстраваць».

КАРАТКА

- Грошы ад продажу білетаў на Калядны турнір па хакеі пойдуць Мазырскаму дзіцячаму дому.
- **ДАІ правядзе комплекс мерапрыемстваў па прафілактыцы п'янства на дарогах.**
- Узбекістан разглядае магчымасць уступлення ў ЕАЭС.
- **На аднаго беспрацоўнага ў Гомельскай вобласці прыпадае сем вакансій.**
- Ва ўкраінскім горадзе Прыпяць упершыню пасля аварыі на ЧАЭС устанавілі навагоднюю ёлку. Ініцыятарамі сталі тураператары, якія спецыялізуюцца на падарожжах у чарнобыльскай зоне.

ПЕРАД БАЛЕМ

Фота БелТА.

Заўтра ў Мінску пройдзе рэспубліканскі Венскі баль для моладзі, на які з'едуцца ўдзельнікі з усёй краіны. Студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава Марыя ПЕТНЯНОС і Ігар СЯМЁНАЎ — сярод запрошаных. Маладыя людзі з хваляваннем рыхтуюцца да свайго першага балю такога маштабу.

Малая радзіма

ЗАМЕСТ ЛЕТНІКА — ЗІМНІК

У Бераставіцкім раёне, што на Гродзеншчыне, другі год працуе рэзідэнцыя беларускага ўладара зімы

СТАР. 4

Фота beresta.by

Сто ідэй для Беларусі

Разумны дом для жывёлы і чароўныя маршруты

Школьнікі Міншчыны прэзентавалі цікавыя праекты

Выстаўка-прэзентацыя абласнога этапу рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» прайшла ў Салігорску. У фае ўпраўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Беларуськалій» яго ўдзельнікі прадэманстравалі 25 вынаходніцкіх і даследчых работ з 15 раёнаў Міншчыны. Распрацоўкі датычыліся самых розных сфер дзейнасці: сельскай гаспадаркі, прамысловасці, турызму, ІТ-тэхналогій.

РАЎНЯЦЦА НА СПАРТСМЕНАЎ

За кожным праектам — не толькі грунтоўныя веды, палёт ідэі і фантазіі, але і вялікія фізічныя і інтэлектуальныя высілкі. Напрыклад, Дзяржынскі раён прэзентаваў аграпрамысловы праект «Разумны дом для жывёлы». Яго распрацавала вучаніца 10 класа Негарэльскай сярэдняй школы № 1 Анжаліка Шыманская. Прыстасаванне ўяўляе сабой сістэму, якая валодае некалькімі функцыямі: аўтаматычнай падачай корму і вады, кантролем паветра. Гэты праект або асобныя яго часткі можна ўкараніць на фермах, сельскагаспадарчых комплексах, у заапарках, зоамагазінах, а таксама ў хатніх умовах.

СТАР. 4

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2020 года, — у падарунак 4 календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

ISSN 1990 - 763X

ЛЮДЗІ, ЭКАНОМІКА І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Гэтыя арыенціры ў рабоце акрэсліў Прэзідэнт, прымаючы кадравыя рашэнні

Сярод учарашніх кадравых пытанняў — узгадненне 12 кандыдатур на пасады кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

На пасаду першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама ўзгоднена кандыдатура Ігара Часнака, на пасаду намесніка Гродзенскага аблвыканкама — Віктара Пранюка.

Ігар Марковіч узначаліць Полацкі райвыканкам, Васіль Шылаў — Верхнядзвінскі, Алег Лындзін — Талачынскі, Сяргей Дылюк — Нараўлянскі, Генадзь Шатуеў — Карэліцкі, Уладзіслаў Гершгорын — Ашмянскі, Аляксандр Гарбачэўскі — Касцюковіцкі, Сяргей Шацкі — Крычаўскі. Аляксандр Сівакоў будзе кіраваць адміністрацыяй Чыгуначнага раёна Гомеля, Пётр Салаўёў — Кастрычніцкага раёна Магілёва.

Аляксандр Лукашэнка перш за ўсё падзякаваў прысутным (большасць з іх да гэтага ўзначальвала іншыя рэгіёны) за работу падчас сёлетняй выбарчай кампаніі і за яе вынікі. «Я аддаю вельмі вялікую ўвагу, як вы заўважылі, гэтаму факту, бо гэта паказчык эфектыўнасці работы нашых органаў улады, яе вертыкалі, гэта паказчык стойкасці і мужнасці тых людзей, якія былі задзейнічаныя ў гэтых выбарах, — растлумачыў Прэзідэнт. — Але, зноў жа, расслабляцца ні ў якім выпадку нельга. Гэта была рэпетыцыя, асноўная дзея нас чакае напярадзе».

Прэзідэнт дадаў, што размова не пра надзвычайную праверку, але выклікаў для маладой суверэннай дзяржавы сёння шмат, і ніхто зараз дакладна не скажа, што нас чакае напярадзе. «Таму мы заўсёды павінны працаваць па максімуме», — рэзюмаваў ён.

І на першым месцы, па словах кіраўніка дзяржавы, у прадстаўніка ўлады павінны стаяць інтарэсы людзей. «Без падтрымкі людзей мы не вырашым ніводнае пытанне ў будучыні», — папярэдзіў ён.

Што датычыцца выклікаў, то пры паспяховай эканоміцы ніводны з іх для нас не страшны. «А эканоміка залежыць ад нас, ад кіраўнікоў. Будзем эфектыўна кіраваць працэсам, краіна не абваліцца. І мы можам вырашыць любую праблему ў Беларусі», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

«Таму — людзі, эканоміка і прафесіяналізм — прыярытэты па ўсіх кірунках, якія будуць уваходзіць у сферу вашай дзейнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт анансаваў візіт у Віцебскую вобласць пасля навагодніх свят, каб прыняць канчатковае рашэнне па развіцці гэтага рэгіёна. «Упэўнены, ва ўсіх абласцях гэты вопыт будзе запатрабаваны», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы паўтарыў, што зона адказнасці старшынь райвыканкамаў ляжыць, перш за ўсё, у сферы дзейнасці і інтарэсах стратных прадпрыемстваў. За такія гаспадаркі кіраўнікі раёнаў, уключаючы намеснікаў старшыні, адказваюць персанальна.

* * *

Аляксандр Лукашэнка таксама ўзгадніў прызначэнне Анатоля Бубена на пасаду старшыні Беларускага дзяржаўнага канцэрна харчовай прамысловасці «Белдзяржхарчпрам» і Ігара Шустава на пасаду генеральнага дырэктара Адкрытага акцыянернага таварыства «МІНСК КРЫШТАЛЬ» — кіруючая кампанія холдынга «МІНСК КРЫШТАЛЬ ГРУП».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу Анатоля Бубена на важнасць прадухілення карупцыі ў канцэрне і падкрэсліў, што калі ў ёй аказваюцца замешаныя падначаленыя, то цень падае і на кіраўніка.

«Нас чакаюць няпростыя часы ў вашай сферы ў сувязі з тым, што, магчыма, зменіцца структура кіравання галіной, якая вырабляе і прадае моцныя алкагольныя напоі, але мы павінны захаваць найлепшыя якасці (калі на гэта пойдзем) старой нашай сістэмы, — сказаў Прэзідэнт. — Дзяржава ні ў якім разе не можа сысці з гэтай сферы. Крый божа, аслабім кантроль — людзей пачнуць спойваць «палёнай» гарэлкай, і людзі пачнуць гінуць, як у некаторых суседніх дзяржавах».

Выраб і продаж алкаголю і тытуню на рынкавых умовах усё роўна павінны заставацца пад строгім кантролем дзяржавы, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

* * *

У рабочым парадку на пасаду першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне Баляслава Пірштука, на пасаду першага намесніка міністра прамысловасці — Сяргея Гунько; на пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення абавязковай юрыдычнай экспертызы нарматыўных прававых актаў Міністэрства юстыцыі — Наталлю Філіпаву; на пасаду старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці — Аксану Цылько; на пасаду генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі — Дзмітрыя Комлача; на пасаду члена Віцебскага аблвыканкама — Вячаслава Хрола.

Кіраўнік дзяржавы прызначыў Сяргея Цярэнцьева, які ўзначальвае дыпламатычную місію Беларусі ў Егіпце і па сумяшчальніцтве — у Судане і Султанаце Аман, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве. На пасаду Генеральнага консула Беларусі ў Шанхаі Прэзідэнт узгадніў кандыдатуру Андрэя Андрэева. На пасаду Пастаяннага паўнамоцнага прадстаўніка Беларусі пры статутных органах Садружнасці Незалежных Дзяржаў прызначана Марына Даўгаполава.

* * *

Напярэдадні каталіцкага Раства, 24 снежня, Прэзідэнт прыняў рашэнне па кадравых пераменах у МУС. На пасаду афіцыйнага прадстаўніка МУС у пасольстве Беларусі ва Украіне і па сумяшчальніцтве ў Малдове Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў кандыдатуру генерал-маёра міліцыі Мікалая Мельчанкі.

На пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка міліцыі грамадскай бяспекі прызначаны генерал-маёр міліцыі Аляксандр Барсукоў. На пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — генерал-маёр міліцыі Сяргей Хаменка.

У той жа дзень Прэзідэнт вызваліў Андрэя Стралецкага ад пасады намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

У ДОБРАЙ СПАРТЫЎНАЙ ФОРМЕ

Прэзідэнту прадэманстравалі ўзоры касцюмаў беларускіх атлетаў на Алімпіядзе-2020

Фота БелТА.

Камплекты распрацоўвалі беларускія кампаніі «Сола-Пінск» і «Світанак», а прадэманстравалі вопратку сярэбраны прызёр Алімпіяды гімнастка Ксенія Санковіч і двухразовая алімпійская віцэ-чэмпіёнка плыўчыха Аляксандра Герасіменя.

«Я скажу, што будзе попыт на гэту форму», — азнаёміўся з касцюмамі Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнту спадабаліся ўсе ўзоры формы, аднак канчатковае рашэнне прынята не было: даручана вывучыць меркаванне грамадскасці, у першую чаргу саміх атлетаў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што форма павінна быць зручнай, а тканіна — якаснай. Кіраўнік дзяржавы таксама лічыць важным, каб беларуская форма была запатрабавана ў аматараў спорту і пасля Алімпіяды.

«Калі будзе тканіна добрая, фарба нармальная, то будуць з задавальненнем купляць», — упэўнены ён. Аляксандру Лукашэнку расказалі, што цяпер беларускія вытворцы абмяркоўваюць стварэнне нацыянальнага брэнда спартыўнага адзення. Прэзідэнту спадабалася гэта ідэя.

Самі спартсменкі ў першую чаргу звяртаюць увагу на функцыянал касцюмаў і якасць тканіны.

«Тут новы класічны дызайн, які вылучае нас, яго можна пазнаць здалёк. Па тканіне ў нас пытанняў не было, яна вельмі лёгкая, свабодная, дыхае. Нічога лепшага, мне здаецца, прыдумаць у Токіа немагчыма», — сказала журналістам Аляксандра Герасіменя. Ксеніі Санковіч па дызайне больш спадабалася яркая бела-чырвоная калекцыя.

«Яна больш патрыятычная, хоць, напэўна, недзе вельмі смелая», — сказала спартсменка.

Варвара МАРОЗАВА.

АДКАЗЫ НА ЎСЕ ПЫТАННІ

Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару радыёстанцыі «Эхо Москвы»

Больш за 140 тысяч праглядаў і некалькі соцень каментарыяў за тры дні на сайце радыёстанцыі. Гэтай размовы чакалі і прадказвалі сенсацыі: інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі дагэтуль планавалася на 6 снежня, але было перанесена праз сустрэчу лідараў Беларусі і Расіі 7 снежня ў Сочы.

Пасля размовы з беларускім Прэзідэнтам галоўны рэдактар «Эхо Москвы» Аляксей Венедыктаў паведаміў журналістам, што ў Расіі рэальна ёсць інфармацыйны голад на беларускую пазіцыю. Выходзіць, цяпер няма: па даных расійскіх аналітыкаў, «Эхо Москвы» — самая цытуемая радыёстанцыя Расіі.

«Адказы свабоднага чалавека, якому не трэба хлусіць і выкручвацца», «А я хацела б такога «прэзідэнта-дыктатара», як Аляксандр Рыгоравіч), дзякуй «Эхо» за інтэрв'ю», «Нармальна. Як мінімум «бацька» цікавейшы за нашага», — адзначаць пазней слухачы і гледачы ў каментарыях.

«Я атрымаў адказы на ўсе пытанні», — сказаў журналістам Аляксей Венедыктаў. А пытанні былі ў тым ліку і вострыя, і асабістыя. А перш за ўсё, прадказальна, палітычныя. Так, размова зайшла пра інтэграцыю. І, на думку Аляксандра Лукашэнкі, развіццё саюзных адносін не цягне за сабой страту суверэнітэту.

Інтэграцыя суверэнных дзяржаў

«Супярэчнасці ніякай няма. Мы дзве суверэнныя незалежныя дзяржавы — Беларусь і Расія. Мы зараз прасоўваем тую інтэграцыю, якая нікольк не прымяншае суверэнітэт ні Расіі, ні Беларусі. Што такое суверэнітэт? Гэта ўлада над тэрыторыяй. У нас ёсць межы, у Расіі ёсць межы, улада ажыццяўляецца ў гэтых межах. І мы ніякім суверэнітэтам не дзелімся. Ні Расія, ні Беларусь», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён упэўнены: нельга забыцца на агульныя карані, якія яднаюць славян. І гэтая роднасць уплывае ў тым ліку на бухгалтэрыю. Напрыклад, на тэрыторыі Беларусі месцяцца дзве высокатэхналагічныя ваенныя базы Расіі, за якія яна не плаціць, у той час як Байканур (на тэрыторыі Казахстана) абыходзіцца ў суму каля двухсот мільёнаў долараў.

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў і навіну пра нібыта стварэнне расійскай базы ваенна-паветраных сіл на беларускай тэрыторыі.

«Навошта гэтая база каля граніц? Авіяцыя ў сучаснай вайне не адыгрывае ніякай ролі. Ніякай. І Пуцін згадзіўся: час падлёту з найбліжэйшай базы да Бабруйска тры хвіліны...» — адказаў Прэзідэнт. Таксама ён паведаміў, што Беларусь закупіць у Расіі дванаццаць самалётаў СУ-30.

І зноў аб нафце...

Беларускі лідар расказаў падрабязнасці перагавораў з Расіяй па пастаўках нафты і газу. У прыватнасці, па яго перакананні, цана на газ не можа быць 152 долары. Беларусь можа пагадзіцца плаціць па такіх цэнах — але каму ад гэтага лепш?

«Але калі расійскі рынак у 25 мільёнаў тон нафты і 22 мільярды кубоў газу сыдзе кудысьці, не крыўдуйце. Я буду шукаць альтэрнатыву — а яе ўсё роўна трэба шукаць. Рэверс нафты. Праз Польшчу ўзяць саудаўскую ці амерыканскую нафту, па трубе завесці рэверсам. У мяне тры трубы нафтаправода «Дружба», на першым этапе я забіраю адну трубу. І рэверсам пастаўляю на НПЗ і перапрацоўваю. Пойдзе нармальна — забяру рэверсам другую трубу. У вас застанецца адна. Вы пастаўляеце пад 70 мільёнаў тон нафты па гэтых трубах на прэміяльны заходні рынак. Дык навошта вы мяне заганяеце ў рашэнне гэтага пытання такім чынам?» — абазначыў сваю пазіцыю Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы настойвае на тым, каб любыя інтэграцыйныя працэсы ішлі на раўнапраўнай аснове, як, напрыклад, гэта адбываецца ў Еўрапейскім саюзе, дзе роўныя галасы маюць усе краіны, незалежна ад памераў, ступені развіцця эканомікі і іншых фактараў.

«А нам нават не намякаюць, а кажуць: «Мы вялікія, а вы меншыя, значыць, будзе так, як у нас». А я кажу: «Не. Тое, што ў вас лепш, давайце зробім агульным здабыткам. Што ў нас — давайце зробім у Расіі», — адзначыў беларускі лідар.

...І смяротным пакаранні

«Вас называюць апошнім дыктатарам Еўропы...» — пачаў чарговае пытанне Аляксей Венедыктаў.

«Не я, ужо не я!» — нават перарваў яго Прэзідэнт, які нібыта заслужыў такое «званне» існаваннем смяротнага пакарання ў краіне.

«Мараторыя не будзе. Таму што не маю права — рэферэндум прыняў гэтае рашэнне. Таму рэферэндум можа толькі адмяніць. Не я яго ўводзіў, яно захавана з тых часоў», — адказаў на пытанне пра смяротнае пакаранне Аляксандр Лукашэнка.

— Усе адмянялі, — заўважыў інтэрв'юер.

— Ну, запытай у Пуціна, задаволены ён ці не, — прапанаваў Прэзідэнт.

— Не, — сам адказаў на такое пытанне Аляксей Венедыктаў. — Але тым не менш мараторый захоўваецца.

«Чым вострае пытанне рашаць, лепш яго не чапаць. Хтосьці сыходзіць з гэтага. Я лічу, што смяротнае пакаранне як папярэджанне некаторым падонкам дапамагае трымаць стабільнасць і разабрацца з бандытызмам», — працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

«А калі, крый божа, з тваімі роднымі, блізкімі... Як мяняецца меркаванне. І ты ўсё роўна не маеш права гэта жыццё адняць. А хто даў права ім адымаць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што пры самай нязначнай магчымасці злачынцы прыгаворваюцца да пажыццёвага зняволення, якое становіцца яшчэ большым для чалавека.

Амаль за дзве гадзіны суразмоўнікі абмеркавалі і спартыўныя праблемы, і пытанні выхавання маладога пакалення, і погляды на будучыню. Напрыканцы інтэрв'ю Аляксей Венедыктаў уручыў кіраўніку дзяржавы падарункавыя шахматы ручной работы. А ў яго ім халадзільніку прыбавілася і беларускіх прадуктаў, бо з Мінска ён павёз падарункавы кошык ад Прэзідэнта.

Варвара МАРОЗАВА.

Акцыя «Нашы дзеці»

«НІБЫТА Ў ДЗЯЦІНСТВЕ ПАБЫВАЎ!»

Ігар Сергеенка падарыў інтэрактыўную панэль Маладзечанскай школе-інтэрнату

Святочная навагодняя атмасфера ў гэтыя дні пануе ў Маладзечанскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнаце. З падарункамі падчас акцыі «Нашы дзеці» сюды завітаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. Дзеці ў адказ падрыхтавалі навагодні спектакль і таксама не пакінулі гасцей без сюрпрызаў, зробленых сваімі рукамі.

Фота БелТА.

І малыя, і дарослыя з аднолькавым энтузіязмам клікалі Дзеда Мароза, выконвалі яго задачкі,танцавалі і весяліліся.

— Сёння я нібыта пабываў у дзяцінстве. Усё, што ўбачыў, уразіла мяне ў добрым сэнсе слова. Гэта выдатныя ўмовы для вучобы, адпачынку і заняткаў спортам, а таксама прафесійны педкалектыў, які акружыў вас клопатам і ўвагай. Адчуваецца, што тут удалося сфарміраваць утульную атмасферу. Вучыцеся, дасягайце вынікаў у спорце і творчасці! А свае сённяшнія ўражанні, я ўпэўнены, вы пранесяце праз усё жыццё, — пажадаў выхаванцам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка, акрамя цацак і салодкіх падарункаў, прэзентаваў неабходную школе інтэрактыўную панэль. Рэч у тым, што ў Маладзечанскай спецыялізаванай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнаце вучацца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Усе яны маюць парушэнні зроку. Пры гэтым у некаторых ёсць і спадарожныя дыягназы.

А **намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ** падарыў школе аўтарэфрактометр. Дыягнастычны апарат дазволіць многія абследаванні рабіць на базе школы. У прыватнасці, даследаваць клінічную рэфракцыю вока, вызначаць крывізну рагавіцы, яе памер і шырыню зрэнак.

У школе каля сотні вучняў ад 6 да 17 гадоў, сярод іх 17 дзяцей-сірот, 68 інвалідаў па зроку (у іх вастрыня зроку не большая за 20 %, з карэкцыяй — не большая за 40).

Маладзечанская школа з'яўляецца рэгіянальным цэнтрам для Мінскай вобласці ў навучанні дзяцей з аслабленым зрокам і рэспубліканскім цэнтрам у навучанні слепаглухіх дзяцей.

— Наша галоўная задача — стабілізаваць зрок, спыніць яго падзенне ў вучняў, — тлумачыць **дырэктар школы Наталля ГЛІНСКАЯ.**

Адметна, што многія выпускнікі школы выбіраюць прафесію педагога ці выхавацеля і пасля вяртаюцца ў родную ўстанову. Сярод іх і музычны педагог Уладзімір Зданкевіч, які выступіў на прадстаўленні ў ролі Дзеда Мароза.

Алена КРАВЕЦ.

УСЁ РОЎНА ДОМА ЛЕПШ

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка прыняў удзел у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» і павіншаваў выхаванцаў Барысаўскага спецыялізаванага дома дзіцяці з надыходзячымі святамі.

Фота БелТА.

«Хоць снегу і няма, але ва ўсіх нас свята на душы. Хутка Новы год, кожны з вас загадае жаданне, і хай усё збудзецца, — сказаў Ігар Петрышэнка, звяртаючыся да дзяцей. — Вы такія прыгожыя, таленавітыя. Няхай усё атрымаецца!»

Павіншаваў віцэ-прэм'ер і супрацоўнікаў дома дзіцяці. На яго думку, ва ўстанове працуюць па загадзе сэрца, і толькі тыя, хто здольны дзяліцца дабрынёй. «Дзеці цудоўныя, а з імі працуюць добрыя ўрачы, педагогі, нянечкі і іншыя спецыялісты. Тут створаны ўсе ўмовы, ёсць якасная матэрыяльна-тэхнічная база. Але галоўнае — гэта дабрыня і шчырасць людзей. Яны забяспечваюць камфорт і ўтульнасць усім тым, хто часова апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі», — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Але нягледзячы на любы камфорт, дзецям усё роўна лепш дома. «Ёсць яшчэ шанц у бацькоў, якія здзейснілі памылку, усё выправіць. Заклікаю іх, каб яны вярнуліся па сваіх дзяцей, якія цяпер жывуць у нашых дзіцячых дамах. Паверце, вашы дзеткі самыя прыгожыя, самыя шчырыя і самыя годныя. Няма нічога цяплей за мацярынскую і бацькаву любоў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Усім дзецям уручылі падарункі. У адказ хлопчыкі і дзяўчынкі падрыхтавалі сувеніры — сваімі рукамі змайстравалі маленькіх снегавікоў. А яшчэ спявалі навагоднія песні, расказвалі вершы, танцавалі каля ёлкі.

Паводле БелТА.

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

У Магілёве з навагоднімі святамі павіншавалі самых маленькіх жыхароў вобласці

Падарункі, грашовыя сертыфікаты, мора цукерак — на навагоднім святе ў магілёўскім спецыялізаваным Доме дзіцяці пабывалі прадстаўнікі мясцовай улады на чале з губернатарам Леанідам Зайцам. Удзел у мерапрыемстве, якое праводзілася ў рамках дабрачыннай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», узяў былы памочнік Прэзідэнта па Магілёўскай вобласці, а цяпер старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл Русы.

На святе прысутнічалі выхаванцы ад паўтара года і да трох. Яны жыва рэагавалі на казку, падрыхтаваную супрацоўнікамі ўстановы, усміхаліся і зусім не баяліся незнаёмых гасцей. Наадварот, праціліся на рукі. Адзін хлопчык утульна размясціўся на руках губернатара, яшчэ адзін хлопчык і дзяўчынка з задавальненнем пайшлі да Міхаіла Русага. Збоку ўсё гэта выглядала вельмі кранальна, а на тварах дарослых чыталіся шчырыя хвалюючыя эмоцыі.

— Новы год — гэта важнае сямейнае свята, якое нясе вельмі добрыя традыцыі, — адзначыў у сваім віншаванні **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — А ўвага да самага дарагога, што ў нас ёсць, — дзяцей, гэта галоўнае. Бо яны — будучае нашай краіны. У гэты ўрачысты дзень вельмі хацелася б пажадаць дзецям шчасця, радасці, каб яны выраслі годнымі грамадзянамі нашай дзяржавы. А выхавальнікам жадаю мужнасці, цярпення і аптымізму ў такой нялёгкай рабоце. Дзякуй вам за той уклад, які вы ўносіце ў выхаванне дзяцей. І паболей радасці вам ў надыходзячым годзе. Магілёўскі аблвыканкам зробіць усё магчымае для таго, каб нашым дзецям жылося і адпачывалася ў добрых умовах.

— Найвялікшая заслуга сацыяльнай палітыкі, якую кіраўнік дзяржавы пачаў праводзіць з 1994 года, клопат пра дзяцей, — адзначыў у сваёй прамове Міхаіл Русы. — Дзякуючы гэтаму, падобныя акцыі праходзяць у кожнай школе, кожнай дзіцячай установе. Спецыялізаваны Дом дзіцяці шматпрофільны — тут і нованароджаныя, і дзеткі больш старэйшыя, і дарослыя разам з хворымі дзецьмі, і паліятыўныя палаты — усе ўмовы, каб зрабіць жыццё дзіцяці, якое трапіла ў бяду, лепшым. Дзяржава робіць усё магчымае, каб дзеці вярталіся ў грамадства паўнавартаснымі яго членамі.

Пасля казачнага прадстаўлення госці прайшліся па пакоях, дзе жывуць і праходзяць рэабілітацыю хворыя дзеці. Яны ацанілі тыя намаганні, якія прыкладаюцца для стварэння ўмоў для пражывання малых. А таксама намаганні тутэйшага персаналу. З дзецьмі працуюць высокакваліфікаваныя кадры, у тым ліку выкладчыкі і медработнікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

КНІГІ І ЗЕФІР АД «ЗВЯЗДЫ»

Атрымалі ў якасці навагодняга падарунка гадаванцы Рудзенскай дапаможнай школы-інтэрната. А звяздоўцам ад малых у адказ дасталіся ўсмешкі, абдымкі, шчырыя пытанні і зацікаўленасць яркімі вокладкамі ды малюнкамі.

Кнігі дзеці расцягнулі са стала ў імгненне вока. Цяпер не адзін дзень пройдзе, пакуль усе выданні збяруцца ў бібліятэцы. Гэта як цацка яркая для многіх, з якой нагуляцца трэба, бо не ўсе нават чытаць умеюць.

— Вучыцеся, чытайце, набірайцеся ведаў, а мы будзем выдаваць яшчэ больш цікавыя і маляўнічыя кнігі, — паабяцала **Тацяна ТРУХАН, вядучы спецыяліст аддзела маркетынгу і падпіскі Выдавецкага дома «Звязда».**

Калі ж дзеці ўдакладнілі, што кнігі далі не проста пагартаць, а ўсё гэтае багацце застанецца ім, а выданні нават можна ўзяць у пакой, дзе яны пасля ўрокаў адпачываюць, імклівай радасці было шмат. А тут яшчэ да абеду на салодкае кожнаму дасталася ўволю зефіру...

Няхай многія з гэтых дзетак маюць пэўны дыягназ, аднак з часам, гаворыць дырэкцыя, многія адаптуюцца ў звычайным асяроддзі, атрымліваюць адукацыю і знаходзяць работу. Развіваючыся, звяздоўцы шчыра жадалі, каб лёс склаўся добра ва ўсіх выхаванцаў гэтага дома.

Ірына СІДАРОК.

❍ Блізкая ўлада

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ СЁЛЕТА

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі, апошнія ў гэтым годзе, пройдуць у суботу, 28 снежня, у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

* старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

* намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

* намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

* намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

* кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

* кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

ЗІМА СТУКАЕ Ў ДЗВЕРЫ?

У апошнія дні старога года злёгку падмарозіць і выпадзе снег, праўда, часам з дажджом

Гэтымі днямі зіма нагадае пра сябе. Тэмпературны фон пачне паніжацца, а ападкі будуць выпадаць у выглядзе снегу і мокрага снегу. Месцамі пачне ўсталёўвацца снежнае покрыва. Так, што ў наступныя выхадныя чакаецца цалкам зімовы характар надвор'я, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу працягнецца паступленне халоднай паветранай масы з паўночнага захаду кантынента. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі пройдзе снег і мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад нуля да мінус 6 градусаў, толькі па паўднёвым усходзе краіны — невялікі плюс.

У нядзелю з Заходняй Еўропы на тэрыторыю Беларусі распаўсюдзіцца вобласць павышанага атмасфернага ціску. Так што будзе пераважна без ападкаў, але падмарозіць. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 2 градусаў да 8 марозу, пры праясненнях панізіцца да мінус 9 — мінус 11 градусаў. Тэмпература ўдзень складзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

У перадапошні дзень адыходзячага года надвор'е зноў паднясе нам сюрпрыз. На тэрыторыю краіны пачнуць паступаць франтальныя раздзелы, якія змяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы. Гэта прывядзе да таго, што ўначы па паўночна-заходняй частцы краіны, а раніцай і днём — на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 да 7 марозу, пры праясненнях — да мінус 8—10 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак, 31 снежня, адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць да нас з боку Балтыйскага мора. Часам будуць выпадаць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень — ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

Уначы 1 студзеня месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, часам мяцеліца. У навагоднюю ноч сіноптыкі прадказваюць у Віцебску і ў Мінску ад мінус 2 градусаў да 4 марозу, а ў Брэсце і ў Гомелі ад нуля да мінус 2 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗАМЕСТ ЛЕТНІКА — ЗІМНІК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яна адкрыта ў дзіцячым аздараўленчым летніку «Бераставіцкі», які знаходзіцца непадалёку ад раённага цэнтра. Тут прапануюць сустрэцца не з традыцыйным Дзедам Марозам, а з беларускімі гаспадарамі зімы — Зюзяй і Завеяй. Мясцовы Бераст-Зюзя не дорыць падарункаў, затое прапануе выпрабаваць сябе і перамагчы абставіны.

Фота beresta.by.

Рэзідэнцыя ў дзіцячым летніку працуе другі год. Праект запусцілі летась, можна сказаць, у эксперыментальным рэжыме — працавалі толькі па заяўках. Але для адзіночных наведвальнікаў такі варыянт аказаўся нязручным — трэба было чакаць, каб сфарміравалася група. Сёлета ідэю падпрацавалі і вырашылі вызначыць для прадстаўленняў пэўны час. Так і зрабілі. Цяпер анімацыйная праграма ідзе двойчы ў дзень аж да старога Новага года.

— Мы сустрэлі падтрымку ад раённай улады, — расказвае **намеснік дырэктара Бераставіцкага цэнтра культуры і народнай творчасці Юрый ЗАЯЦ.** — Больш за тое, прапанова засяліць рэзідэнцыю не Дзедам Марозам, а беларускім уладаром зімы Зюзяй, таксама прыйшла ад кіраўніцтва раёна. Так летнік набыў новы статус і незвычайных міфалагічных персанажаў.

Ролю Бераст-Зюзі ўзяў на сябе сам Юрый Заяц. Увогуле, справа для яго звыклая, шмат гадоў ён выступаў у ролі Дзеда Мароза. Але аказалася, што новы персанаж даволі эксцэнтрычны. Напрыклад, згодна з паданнем, ён ходзіць босы і носіць булаву замест посаха.

— Зюзя — гэта не Дзед Мароз, хоць таксама даволі сталы, з белай барадой, але адзеты значна прасцей — у звычайным сялянскім кажушку, са стужкай на валасах, і, што самае незвычайнае, з босымі нагамі. У такім стане мне прыйшлося летась адкрываць рэзідэнцыю, праўда, у лёгкім абутку, — жартуе Юрый.

Свайго героя не прыйшлося доўга шукаць. Дастаткова толькі пазнаёміцца з беларускай міфалогіяй. А тут вам і Дамавік, і Лазнік, і Лесавік, і Вастроуха, і Хлеўнік, і Балотнік, і Злыдні... Знайшоўся і ўладар зімы — Зюзя. Каб яго задобрыць, беларусы на каляды першую лыжку кучці кідалі яму ў акно, прасілі мароз сцішыцца.

Для забаў на тэрыторыі рэзідэнцыі абсталявана шэсць пляцовак, на якіх сустракаюць самыя розныя міфалагічныя персанажы з гаспадыняй Завеяй. Галоўны нумар праграмы — калядны фэст. Адным з выпрабаванняў стала хада на лыжах. Некаторыя добра спраўляюцца нават без снегу. У рэзідэнцыі частуюць гарачымі стравамі — юшкай і кашай, гарачым чаем.

— Сёлета мы робім акцэнт на міфалогію — злыя і добрыя духі. Калі ўсе выпрабаванні пройдзены, дзеці ідуць да Зюзі, ён іх віншуе, і яны ўжо могуць атрымаць заслужылі іх, — тлумачыць Юрый Заяц.

Ці зразумелі дзеці новага персанажа? Па словах **начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бераставіцкага райвыканкама Алены ІГНАТОВІЧ**, дзяцей трэба зацікавіць. Тады ўсё атрымаецца. Напрыклад, беларускага зімніка Зюзю спрабавалі ўкараніць у сваёй праграме на папулярнай гродзенскай турыстычнай базе, але ідэя не прыжылася, і ад гэтага персанажа адмовіліся. У Бераставіцы вырашылі, наадварот, гэту тэму ўдасканаліць, а сам персанаж зрабіць традыцыйным для свайго рэгіёна. Бо, сапраўды, Дзедаў Морозаў і так хапае, а вось Бераст-Зюзя — адзін такі на ўсю Гродзенскую вобласць.

— Мы правялі шырокую інфармацыйную кампанію, — паведаміла Алена Ігнатовіч. — У школы накіравалі пісьмы для дзяцей ад Бераст-Зюзі і Завеі з запрашэннем наведаць рэзідэнцыю. Гэта вельмі прыгожа аформленыя канверты. У пісьме расказваецца аб тым, хто такі Зюзя. Бо Дзеда Мароза ўсе ведаюць, а вось міфалагічны Зюзя, які між тым з'яўляецца беларускім зімнікам, амаль невядомы. Да таго ж ён не канкурэнт Дзеду Морозу, бо не кладзе падарункі пад ёлку, таму будзе мець перавагу, затое Зюзя можа замарозіць час, і Новы год не прыйдзе, калі ім грэбаваць. Менавіта такая ідэя ляжыць у аснове навагодняга квэста.

Ужо зараз у райвыканкаме адзначаюць высокі попыт на анімацыйную праграму ў незвычайнай зімовай рэзідэнцыі. Сюды наведваюцца як мясцовыя школьнікі, так і з суседніх раёнаў. Зручна і для турыстаў — рэзідэнцыя знаходзіцца якраз на шляху да Белавежскай пушчы.

Аддзел рамёстваў падрыхтаваў адпаведныя сувеніры. Іх можна набыць за сімвалічную цану ці выйграць у латарэю. Цацкі на ёлцы таксама незвычайныя, яны зроблены з прыродных матэрыялаў. Прычым удзел у гэтым прымалі і дарослыя, і дзеці. Усё зроблена сваімі рукамі. Выстаўка-кірмаш так і называецца — «Самаробны цуд». Як адзначылі арганізатары, у рэзідэнцыі хацелася паказаць як мага паўней нашу беларускую этнічную культуру. А ў нечым — з іншага боку. Уся анімацыйная праграма вядзецца на беларускай мове.

Дарэчы, Бераст-Зюзя і Завея не сядзяць бязвылазна ў сваёй рэзідэнцыі. У навагоднюю ноч яны прыйдуць на гарадскую плошчу, каб разам з усімі святкаваць прыход Новага года.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Разумны дом для жывёлы і чароўныя маршруты

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навучэнцы Артур Царыковіч і Анастасія Крыўленя са Слуцкага раёна з праектам Phone Paint Detector стварылі праграму PPD, якая дазваляе карыстальнікам атрымаць усю інфармацыю пра карціны ў музеях, што іх цікавіць, без выкарыстання QR-кодаў, метак, аўдыягідаў. На сервер супрацоўнікі музея, галерэі дадаюць выяву карціны з яе апісаннем. З дапамогай праграмы можна ўвайсці ў базу даных зрабіць здымак і атрымаць расказ аб карціне.

Аўтарскую распрацоўку «Камп'ютарная гульня патрыятычнай накіраванасці «Знакамітыя спартсмены Беларусі» прадставіў вучань 9 класа сярэдняй школы № 3 горада Крупкі Мацвей Лебедзеў. Гульня-віктарына складаецца з пяці тураў і створана ў аб'ектна арыентаваным асяроддзі праграмавання Delphi. Яе можна праводзіць ва ўстановах сярэдняй, спартыўнай адукацыі, выкарыстоўваць на школьных раённых, абласных алімпіядах. Чаму тэматыка распрацоўкі — менавіта спартсмены Беларусі і іх дасягненні?

— Мне 15 гадоў, а маладыя людзі ў такім узросце пачынаюць думаць, з каго браць прыклад. Я са сваімі сябрамі вырашыў раўняцца на спартсменаў. Менавіта яны штодзённымі ўпартымі трэніроўкамі дабіваюцца высокіх вынікаў. І я хачу паказаць людзям, што ўсім ахвотным можна дасягнуць вяршынь.

— Гэтая гульня — працяг праекта «Беларусь спартыўная», якая на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Патрыёт.by» атрымала Дыплом II ступені, — удакладняе кіраўнік праекта Вольга Азадоева. — Гэта — камп'ютарная версія гульні. Спыніліся на такім варыянце таму, што цяпер у школах карыстанне мабільнымі тэлефонамі абмежавана. Перавага яго ў тым, што дзеці могуць сабрацца разам за камп'ютарам, пагуляць і задумацца, каго выбраць сваім ідэалам — Кацярыну Карстэн, Дар'ю Домрачаву ці некага іншага. Часта кумірамі маладых людзей становяцца блогеры, рэперы і так далей. А мы хочам паказаць, што павінны знаходзіць герояў сярод сваіх спартсменаў. Не абавязкова, што ты будзеш спартсменам, але мэтанакіравана, як і яны, трэба імкнуцца дасягнуць нейкіх вынікаў.

Акрамя таго, юны вынаходнік са сваім кіраўніком ствараюць яшчэ і мабільную версію гульні.

АДХОДЫ — РЭАЛЬНЫЯ ДАХОДЫ

У Паліны Чарапан з Вілейскай школы № 1 — сацыяльны праект «Чароўныя маршруты». Ён мае на мэце дапамогу пажылым людзям, дзецям-інвалідам, сіротам, уразлівым катэгорыям грамадзян.

— Мы наведваем інтэрнаты для састарэлых, інвалідаў, дзяцей, бальніцы, сем'і, дзе выхаванцы знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Сваім падапечным уручаем падарункі, ладзім для іх розныя мерапрыемствы, віншуем са святамі. Лічым, што валанцёрства вельмі неабходнае ў нашым грамадстве, бо ў ім шмат людзей, якія маюць патрэбу ў падтрымцы, — упэўнена Паліна.

Гэты праект ужо апрабаваны на практыцы і паказаў сваю эфектыўнасць. Бо тут паміж яго ўдзельнікамі размеркаваны канкрэтныя абавязкі. Напрыклад, у кожнай групы — свой маршрут. Група «Далонькі» шэфствуе над дзецьмі, «Белы голуб» — над пацыентамі бальніцы сястрынскага догляду. А работу кожнай з іх накіроўвае і каардынуе куратар.

«Адходы — гэта рэальныя даходы», — лічыць Юлія Гапановіч з аграгарадка Грыцкевічы Нясвіжскага раёна. Дзяўчынка разам са сваім кіраўніком — настаўнікам хіміі і біялогіі Андрэем Радаманам прадэманстравалі аднайменны праект. Тандэм распрацаваў метад па ператварэнні тарфянога попелу ў электраліт і з дапамогай акумулятара — у крыніцу энергазабеспячэння. Яны плануюць укараніць сваё вынаходніцтва ў вытворчасць. У аграгарадку працуе кацельня на мясцовым паліве. І перапрацаваныя тарфяныя адходы грувасяцца каля будынка. Гэта непрыгожа, не лепшым чынам уздзейнічае на навакольнае асяроддзе.

Вёска старэе, вымірае, выпускнікі пасля заканчэння школы ад'язджаюць у горад. Як спыніць гэты працэс, задумаліся ў Лядскім дзіцячым садзе — сярэдняй школе Чэрвеньскага раёна. І вырашылі заняцца сельскай гаспадаркай, каб на асабістым прыкладзе паказаць, што гэта прыбытковая справа.

— На ўчастку мы вырошчваем экалагічна чыстую прадукцыю, вучым гасцей, як атрымліваць багаты ўраджай, асвойваем і новыя культуры. Мы плануем на базе школы стварыць адукацыйную пляцоўку, дзе будуць праводзіць заняткі спецыялісты па арганічным земляробстве. А мы станем ім дапамагаць, паказваць майстар-класы для насельніцтва. Думаю, гэтая ідэя мае вялікі эканамічны эфект для Беларусі і вырашае праблему замацавання моладзі на вёсцы, прыцягнення людзей да адкрыцця малога і сярэдняга бізнесу на сяле, — упэўнены кіраўнік праекта Ірына Жаваранкава і яе падапечныя Аляксандра Пяхота, Паліна Соніч і Яна Ігнатовіч.

ЕЖА БУДУЧАГА

Ульяна Аскальдовіч з Дзераўнянскай сярэдняй школы Стаўбцоўскага раёна прадставіла праект «Стварэнне інтэрактыўнай карты і тапонімаў аграгарадка Дзераўная і яго ваколіц». Ён увабраў у сябе некалькі прадметаў — геаграфію, гісторыю, часткова беларускую мову, інфарматыку. Матэрыялаў для стварэння карты было не надта шмат, прызнаецца Ульяна. Дзякуючы літаратурнаму музею, што дзейнічае ў школе, апытанню мясцовых жыхароў, удалося сабраць звесткі пра гісторыю, культуру, традыцыі, быт мясцовасці.

— Ідэя стварэння праекта належыць педагогам і вучням школы, што вельмі актуальна ў Год малой радзімы, — кажа настаўніца гісторыі і геаграфіі Таццяна Арленка. — Такой карты, думаю, няма ва ўстановах адукацыі краіны. Таму да гэтай работы могуць далучыцца ўсе ахвотныя.

Ну а салігарчане, якія прымалі гасцей, прэзентавалі праект Аляксандра Карабко «Future food — ежа будучага». Юны вынаходнік прапануе спрасціць заказ страў і ўзаемадзеянне кліента з персаналам у рэстаранах і выводзіць заказ на новы ўзровень абслугоўвання. Кліент з дапамогай сканавання QR-кода зможа ўбачыць 3D-выяву ежы і вагу порцыі. У выніку, калі наведвальнік упершыню ўбачыць у меню пэўную назву стравы, ён зможа разабрацца, што гэта такое, без афіцыянта. З дапамогай праграмы можна таксама рабіць заказы з дастаўкай, атрымліваць інфармацыю пра рэстараны.

«Мы плануем на базе школы стварыць адукацыйную пляцоўку, дзе будуць праводзіць заняткі спецыялісты па арганічным земляробстве. А мы станем ім дапамагаць, паказваць майстар-класы для насельніцтва».

Традыцыйна інавацыйныя праекты і распрацоўкі ацэньваў экспертны савет, куды ўвайшлі прадстаўнікі выканаўчай улады, упраўлення адукацыі, грамадскіх арганізацый, спецыялісты цэнтра тэхнічнай творчасці Салігорска і «Беларуськалія». Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі падарункі. Найлепшыя праекты будуць прадстаўлены ў рэспубліканскім конкурсе.

Дадам, праект «100 ідэй для Беларусі» з'яўляецца базавым стартапам для развіцця нацыянальнага руху маладых вучоных, вынаходнікаў, рацыяналізатараў. Гэта выдатная магчымасць заявіць пра сябе на ўсю краіну, атрымаць дапамогу ў развіцці і суправаджэнні аўтарскага праекта.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

АПОШНІ АРГУМЕНТ

...Вёсачка ў нас была невялічкая, двароў, можа, 40. На фронт з іх пайшлі 32 гаспадары, вярнулася — толькі палова: той паранены, той кантужаны. Але ж (гэта святое) мужчынскія абавязкі выконвалі ўсе: з'яўляліся ў вёсцы дзеткі — і ў жонак, і ў асобных удоў. Ад каго, людзі, можа, і здагадваліся, але ж да пары да часу маўчалі.

Недзе з пачатку шасцідзясятых калгас стаў славіцца ўраджаямі лёну: людзі і зараблялі на ім нядрэнна, і прэміі мелі. Аднойчы — дык нават цукрам. Во дзе шчасце было, асабліва дзятве: лусту хлеба ў ваду на імгненне, потым — у торбачку з цукрам і... Смаката!

А далей — болей: навучыліся ледзянцы рабіць. Прапальвалі грубку-буржуйку, на гарачую — клалі паперу, на яе — слой цукрыку: пара хвілін і ледзянец гатовы. Дзеці — шчаслівыя, іх маці — і пагатоў: ёсць сэнс працаваць, старацца...

У брыгадзе тады было два звяны па вырошчванні лёну. Адным камандавала Матруна, другім — Праскоўя. Матрунін муж з вайны не вярнуўся — адна цягнула траіх дзяцей. А вось Параска свайго прыждала...

Карацей, першая жанчына з гора, другая мо з радасці, але шчыравалі абедзве. Зімой збіралі попел, раўніва глядзелі, каб на ўчастку пароўну вывезлі гною, вясной сачылі за работай трактарыстаў, каб добра ўзаралі зямлю, на праполку выводзілі дзяцей, а летам хадзілі глядзець, чый жа даўгунец чысцейшы ды вышэйшы?

І вось нарэшце — восень, час падлікаў і... Паказчыкі ў абодвух звенняў аднолькавыя. Каму ж тады аддаць перамогу і прэмію?

Склікалі сход. Першым выступіў старшыня калгаса: падзякаваў жанчынам за працу, абвясціў нечаканыя вынікі, даў слова самім звеннявым.

Праскоўя першай стала хваліць сваіх работніц, казаць, што яе звяно працавала, не пакладаючы рук.

— А маё хіба горай? — абурылася Матруна. — У нас што — лён карацейшы альбо грубейшы?

Слова за слова — узнікла перапалка, жанчыны, што называецца, перайшлі на асобы:

— А ў цябе ў хаце як сем свіней апарасілася! — заявіла Параска.

— А ў цябе гарод пустазеллем зарос, — адбрыла Матруна.

— А твае дзеці нямытыя ходзяць!

— А твая карова аб...ся па самы хрыбет!

— А твой Грыша да мяне прыходзіць, — у запале гукнула Матруна.

І тут, што называецца, ці-шы-ня...

Трошкі пазней ад рогату зазвінелі шыбы, прэмію падзялілі пароўну, сход аб'явілі закрытым.

Л. М.,

г. Мінск.

НЕКАМУ — ЖАРТАЧКІ... А НЕКАМУ...

Мне ў свой час давялося працаваць у адной раённай газеце, але ў рэдакцыі я мала стыкаўся, аб'язжаў калгас за калгасам.

Помню, у адзін прыехаў з самай раніцы, перад нарадай. Вырашыў папрысутнічаць. Сяджу разам са спецыялістамі, чакаю грунтоўнай размовы, а яна ўсё не пачынаецца. Пытаю ў суседа, з якой прычыны затрымка?

— Мухамор спазняецца, — кажа той.

— Гэта, — пытаюся, — нехта са старых кадраў? Ці вельмі ўжо шкодных?

— Не, гэта аграном наш.

Толькі ўспомнілі яго, — бачым — дзверы ў кабінет адчыняюцца, заходзіць досыць малады сімпатычны мужчына са шлемам...

— Дык адкуль тады мянушка? — цікаўлюся ў суседа. — На выгляд — неблагі чалавек.

— Яно так... Але ж дыму без агню не бывае. Ён у райцэнтр неяк паехаў, вырашыў заадно на калгасны рынак зазірнуць... Матацыкл каля ўвахода паставіў, шлем на ручцы пакінуў... Ён са скуранымі «падвязкамі» быў, а да ўсяго — ярка-чырвонага колеру... Акурат як шапка ў грыба. Вось нехта і намаляваў на ім беленькіх бубачак... Аграном з рынку вярнуўся, убачыў іх, палаяўся, а больш жа нічога не зробіш: фарба высахла... І ехаць трэба. Насунуў ён шлем на галаву і гайда ў вёску. А тут жа нічога не заржавее. Нехта ляпнуў: «Гляньце, мухамор паехаў!», вось мянушка і прыляпілася.

...Яна часам і сапраўды як тая фарба: не змыеш, каб і хацеў.

Віталь Жураўскі,

г. Жодзіна.

ВЫТОКІ ТРАДЫЦЫЙ

Мой сябра ажаніўся па восені. Яго абранніца была прыезджая, але на новым месцы прыжылася хутка. Бегала на ўсе канцэрты ды іншыя мерапрыемствы, вадзіла, а дакладней цягала з сабою мужа. Казала: «Пакуль дзяцей няма, грэх заседжвацца дома».

Вось і ў навагоднюю ноч падбіла сужэнца схадзіць на плошчу да цэнтральнай ёлкі. Той, бедны, пярэчыў: казаў, што глядзець там асабліва няма чаго, што без кампаніі ім сумна будзе, ды і надвор'е... Снег, які зранку выпаў, зверху растаў, на вуліцы — сапраўдная коўзанка. Але ж дзе там! Калі яго палавіна нечага захацела, то спрачацца — толькі нервы матаць.

Прыбраліся яны (жонка, дарэчы, у светлае футра і боцікі на шпільках), выйшлі за веснічкі, потым яшчэ колькі крокаў зрабілі і...

Раз'ехаліся на галалёдзе тыя шпілечкі, модніца, як той казаў, села ў лужыну... Шапка ў адным баку, сумачка — у другім. Побач муж у недарэчнай позе.

Сяк-так падняў ён сваю абранніцу.

— Ну што гэта такое? — стала абурацца яна. — Ну чаму пяску ніхто не насыпаў?

— Можна было, — згадзіўся муж, — але ж з цябе тады не толькі вада сцякала б, але і пясочак сыпаўся. А так — можна ісці далей: з кіламетр яшчэ да ёлкі.

— Ты што, з глузду з'ехаў? — пакрыўдзілася жонка. — Якая ёлка? Як я на людзі з'яўлюся ў такім вось выглядзе?!

— Ды не бойся: на ролю Бабы-Ягі — якраз. Ты ж хацела відовішчаў?

— Так, хацела, але перадумала... Чаго мы ля ёлкі не бачылі? Пайшлі назад.

...З таго самага часу на Новы год гэта сям'я з хаты, можна сказаць, не выходзіць — сядзіць дома.

Анатоль Палынскі,

г. Беразіно.

ПРА КРЫЖ І КРЫЖЫКІ

...Алена і Каця сябруюць з дзяцінства, здаўна, бо цяпер у абедзвюх ужо ўнукі і ўнучкі. Сем'і дзяцей жывуць асобна ад іх, а сяброўкі — побач, у адным шматпавярховым доме. Не дзіва, што часта бачацца, што разам, як многія жанчыны, любяць хадзіць па крамах. Нават у ювелірную неяк трапілі і выйшлі адтуль з абноўкамі: купілі сабе па залатым ланцужку, па крыжыку... У іх яны і былі — сяброўкі з маленства насілі (век атэістаў для камуністаў), але ж старыя, з нейкага пачарнелага металу, на вяровачках... Да Бога, у лепшы свет, — падумалі жанчыны, — лепш будзе ісці з новымі.

Вырашылі так разам, удзвюх, але ж потым да адной, да Каці, на канікулы прыехала любімая ўнучка, і бабуля не ўтрымалася — аддала ёй свой крыжык: хай, маўляў, будзе на памяць.

Аддала яго і, можа, забылася б, але...

Занядужала ў хуткім часе аж да таго, што злягла ў бальніцу. Муж яе Фёдар і сяброўка Алена па чарзе прыходзілі праведваць: прыносілі тое-сёе з прысмакаў, падбадзёрвалі, расказвалі пра хатнія справы і, вядома ж, чакалі. У дзень, калі Кацю выпісвалі, падлогі ў хаце былі чысцюткія, абед згатаваны... «Выходзіць, мой Федзя па-ранейшаму любіць мяне, шкадуе...» — парадавалася жанчына, кіруючы ў зале да свайго вялікага люстэрка, а паглядзелася і...

Вачам не паверыла: на ім, з правага боку, вісеў залаты крыжык. Той самы... Аленін, бо чый жа яшчэ, калі яна, Каця, унучцы свой падарыла?

«Во якая сяброўка! Ды змяя ж падкалодная! Выходзіць, гэта яна тут гаспадарыла?! — ставячы крыж на сяброўстве, думала Кацярына. — Чакала, што я ў бальніцы памру? На маё месца збірацца стала?!

Ад агіды і крыўды ў жонкі балела сэрца. Аднак прыслухоўвацца да яго Каці не выпадала: трэ было нешта рабіць.

Перш-наперш схавала ў шафе «знойдзены» крыжык («Забылася? Дык назад не аддам! Хай пашукае!»), потым сабрала свае самыя каштоўныя рэчы (набор сярэбраных відэльцаў і лыжак, пацеркі-пярсцёнкі, новую прыгожую коўдру...) і завезла нявесткі. «Бяры, — сказала, — бо раптам памру, вам нічога не дастанецца — усё прахам пойдзе».

...А Фёдар тым часам глядзеў на сваю жонку і нічога не разумеў: як падмянілі яе ў раённай бальніцы: то гыркае, то плача, бедная, то маўчыць, а то заявіла раптам, што дома яе любімых рэчаў няма і што вінаваты ў тым Фёдар з... Аленаю.

«Ты што — зусім ужо з глузду з'ехала?» — хацеў спытаць муж, але ж устрымаўся. Здалёк пачаў: сказаў, што ім абодвум, на жаль, не па 30, што памяць трошкі не тая... І ў яго вось таксама. «Пакуль ты хварэла, — уздыхнуў, — нявестка ўнуччын крыжык залаты прывезла — папрасіла зашчапку ў ланцужку паправіць. Я падрадзіўся... І некуды ж іх паклаў (мо як ты свае рэчы?), а куды — хоць забі, не прыпомню! Здавалася, на люстэрка павесіў...»

— Ведаеш, мы іх разам пашукаем. І знойдзем — слова даю, — паабяцала Каця. — А пакуль — я да Алены збегаю: адна нага тут, другая там.

...І сапраўды, нібы крылы ў жанчыны выраслі — ад шчырай пяшчоты да мужа, ад радасці за сябе, такую дурніцу, ад гонару за сяброўку.

...Чытач можа спытаць: «А што ж тыя рэчы? Нябось забрала свякроў у сваёй нявесткі?»

І не падумала, бо яны ёй не вельмі і патрэбны былі.

А вось чаго хацелася б... Каб даў бог трохі здароўя і часу — пажыць, нечым парадаваць сваіх блізкіх — мужа, дзяцей і сяброў.

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Пункт 1.2. изложить в следующей редакции:

«1.2. Местонахождение эмитента, номер телефона и факса, адрес официального сайта эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет, электронный адрес (e-mail).

Местонахождение: Республика Беларусь, 220045, г. Минск, проспект Дзержинского, 127, помещение 488;

телефон: 8 (017) 302-84-10, факс: 8 (017) 302-84-15;

электронный адрес (e-mail): info@tapas.by;

официальный сайт Эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет: нет»;

Пункт 1.10. изложить в следующей редакции:

«1.10. Сведения о лице, осуществляющем полномочия единоличного исполнительного органа эмитента.

Функции исполнительного органа – директора Эмитента переданы по договору на управление компанией от 30.10.2019 № 30-10/2019 управляющей компании Обществу с ограниченной ответственностью «ТАПАС».

Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.

Генеральный директор ООО «ТАПАС» –
управляющей компании ООО «БЕЛХАНТЕР» С. П. Ставер

Генеральный директор ООО «ТАПАС» –
организации, оказывающей эмитенту услуги
по ведению бухгалтерского учета (договор
на оказание бухгалтерских услуг от 09.10.2019 № б/н) С. П. Ставер

Первый заместитель генерального директора
ООО «ТАПАС» – управляющей компании
ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» О. С. Арабей

Информация о сокращении количества акций

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», расположенное по адресу: 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, сообщает, что 23.12.2019 внесены изменения в Государственный реестр ценных бумаг связи с сокращением количества простых (обыкновенных) акций. Размер уставного фонда после внесения изменений в Государственный реестр ценных бумаг составляет 3507105,50 белорусского рубля, разделен на 369169 простых (обыкновенных) акций.

УНП 400078768

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Надыходзіць перыяд, калі можна не думаць пра кар'ерныя дасягненні і прафесійны ўзровень і прысвяціць больш часу асабістаму і сямейнаму жыццю. У аўторак праявіце рашучасць і актыўнасць, тады добра адзначыце галоўную ноч у годзе. Зоркі абяцаюць, што вы знойдзеце пад ёлкай нямала прыемных сюрпрызаў.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні паспрабуйце атрымаць ад жыцця задавальненне, будзьце добразычлівыя і адкрытыя для новых знаёмстваў. Скончыўся перыяд сварак з партнёрамі, цяпер вашай задачай будзе ісці насустрач адно аднаму, працаваць над адносінамі. Не купляйцеся на шчодрыя абяцанкі, і тады апыняцеся ў выйгрышы. У другой палове тыдня ёсць магчымасць клопатаў і перажыванняў, звязаных з праблемамі сяброў.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні ўсе перашкоды або абмежаванні на вашым шляху проста знікнуць. Дзейнічайце, рухайцеся наперад. Вы зможаце сустрэць Новы год менавіта так, як марылі: у вясёлай кампаніі прыемных людзей. І атрымаеце нямала падарункаў ад лёсу. Вы будзеце ў выдатным настроі, адчуеце гармонію з сабой і з светам. Усе праблемы застануцца ў мінулым годзе.

РАК. Пачатак тыдня пройдзе ў клопатах па падрыхтоўцы да свята. Упарадкуйце свае дзеянні, выдаткаваўшы пэўны час на планаванне, і вам удасца справіцца з усім без мітусні і спазнення. Вы атрымаеце патрэбны вынік, што адаб'ецца на вашым настроі і ўмацуе ваш аўтарытэт сярод навакольных. Ёсць імавернасць сустрэць Новы год у шумнай кампаніі і ў незвычайным месцы.

ЛЕЎ. Тыдзень спрыяльны для наладжвання важных дзелавых і сяброўскіх сувязяў. У святочнай, нефармальнай абстаноўцы вы можаце знайсці новую работу або спонсара. Не выключана, што частку ўвагі давядзецца пераключыць на рашэнне праблем людзей, якія залежаць ад вас. Але гэтыя намаганні акупяцца. Можаце разлічваць на дапамогу сяброў. У суботу паступіць доўгачаканая інфармацыя, якая, хутчэй за ўсё, пацешыць і дасць новыя магчымасці для самаўдасканалення.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні воля, энергія і шчаслівы выпадак могуць апынуцца ў адной запрэжцы і прыкметна прасунуць вас наперад. Але не паддавайцеся спакусе разлічваць выключна на шанцаванне — старанна плануйце свае справы, і вы дасягняце намечаных мэт. Навагодняя ноч пройдзе нестандартна, будзьце гатовыя да ўсяго.

ШАЛІ. Паспрабуйце на гэтым тыдні не паддавацца на спакусы і правакацыі. Лепш загадзя азначыць лінію сваіх паводзін і прытрымлівацца яе што б там ні стала. Ні з кім не сварыцеся, асабліва за святочным сталом. Лепш менш гаварыць, інакш нагаворыце лішняга. У чацвер і пятніцу схадзіце ў госці да родных ці сяброў. Магчымыя добрыя навіны, перспектыўныя прапановы.

СКАРПІЁН. Вас чакаюць прыбытак і поспех у справах. Толькі лепш не прымаць паспешлівых рашэнняў, неабходна ўсё старанна прадумаць і аб'ектыўна ацаніць. Новы год прынясе поспех і моцныя пачуцці, што зменіць ваша жыццё ў лепшы бок. У выхадныя з'явіцца магчымасць завяршыць назапашаныя хатнія справы. Паспрабуйце быць больш уважлівымі ў адносінах да блізкіх людзей.

СТРАЛЕЦ. Пачатак тыдня спрыяльны для кар'еры і вырашэння важных спраў. У панядзелак пажадана не ўпарціцца, адстойваючы свой аўтарытэт і кампетэнтнасць, а прыслухацца да мудрых і своечасовых парад, бо вы ад гэтага толькі выйграеце. У навагоднюю ноч надасца магчымасць бліснуць у гасцях сваёй эрудыцыяй, атрымаеце шмат тэлефонных званкоў і прыемных сюрпрызаў. Другую палову тыдня пажадана прысвяціць адпачынку. У суботу магчыма сур'ёзная размова са сваякамі — праявіце тактоўнасць і не апярэджвайце падзеі.

КАЗЯРОГ. На гэтым тыдні вам будзе проста неабходна ўраўнаважыць свае і грамадскія інтарэсы. Пашырце кола зносін, запрасіце на свята сяброў і сяброў сяброў. У пачатку тыдня важная актыўнасць у любых дзеяннях, такім чынам вы падрыхтуеце трамплін для паспяховых пачынанняў. На сераду і чацвер не варта планаваць нічога сур'ёзнага. Адпачніце і выспіцеся пасля навагодняй ночы.

ВАДАЛІЙ. На гэтым тыдні важна пагадзіцца з тым, што любая выпушчаная дробязь можа прывесці да непрадказальных наступстваў. Каб быць на вышыні, вам неабходна прадумаць усё: як вы будзеце гаварыць, рухацца, які ў вас імідж. А вось з рызыкоўнымі дзеяннямі пажадана пачакаць. Ваша актыўнасць будзе выніковая, толькі не бярыце ўсё на сябе, парайцеся з сям'ёй, разам вырашыце, як лепш правесці святы. Канец тыдня прысвяціце аднаўленню сіл пасля чарады вечарынак.

РЫБЫ. На гэтым тыдні паспрабуйце злавіць сваю хвалю, а не падладжвацца пад іншых, хоць вам пакуль і не варта моцна вылучацца на фоне калектыву. Асаблівых дасягненняў на рабоце не прадбачыцца, усе занятыя чаканнем свята. Каб з чацвяргa да нядзелі ў доме не склалася гнятлівая абстаноўка, ад вас асабіста спатрэбіцца максімум такту і дабрыні. У нядзелю атрымаецца вырашыць большую частку набалелых хатніх праблем.

Даты Падзеі Людзі

27 СНЕЖНЯ

У краіне

1919 год — нарадзілася Галіна Кліменцьеўна Макарава, актрыса, народная артыстка Беларусі (1967), СССР (1980). У 1938 годзе скончыла студыю Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, працавала ў ім. Стварыла галерэю каларытных вобразаў жанчын з народа. Яркі самабытны талент актрысы найбольш поўна раскрыўся ў нацыянальным рэпертуары. Здымалася ў кіна- і тэлестужках «Удовы», «Цягнік смерці падрываць нельга», «Час выбраў нас». Памерла ў 1993 годзе.

1949 год — нарадзілася Людміла Васілеўна Забалоцкая, беларуская паэтка. Працавала ў выдавецтве «БелСЭ», на Беларускім тэлебачанні, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Пралеска», у выдавецтве «Полымя», у часопісе «Адукацыя і выхаванне». Аўтар паэтычных зборнікаў «Сакавік», «Святло палыну», «Струны памяці» і іншых. Пераклала на беларускую мову раман Вальтэра Скота «Айвенга».

1949 год — нарадзілася Святлана Лаўрэнцьеўна Лясун, беларуская баяністка, педагог, заслужаная артыстка Беларусі (1987), народная артыстка Беларусі (2001).

1974 год — уведзена ў эксплуатацыю першая чарга Вілейска-Мінскай воднай сістэмы — Вілейскае вадасховішча (найбуйнейшы штучны вадаём Беларусі) і галоўны гідравузел. У гэты ж дзень здадзены ў эксплуатацыю электрыфікаваны ўчастак Беларускай чыгункі Мінск — Барысаў.

1979 год — завершана электрыфікацыя чыгуначнага ўчастка Орша — Вязьма.

1984 год — створаны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Лебядзіны».

У свеце

1904 год — у Дубліне адкрыўся новы тэатр The Abbey Theatre. Ён стаў першым тэатрам у свеце, які ўтрымліваўся на дзяржаўныя датацыі.

1929 год — у сваім выступленні на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў Іосіф Сталін абвясціў аб пераходзе да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа.

1932 год — у СССР уведзена пашпартная сістэма. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пашпарты ўнутры краіны былі адменены. З іх адраджэннем паўстаў і інстытут прапіскі. Парушэнне парадку пашпартнай сістэмы з гэтага часу магло мець наступствам прыцягненне да адміністрацыйнай і нават крымінальнай адказнасці.

1934 год — нарадзіўся Мікалай Аляксеевіч Слічэнка, расійскі спявак, акцёр, рэжысёр, мастацкі кіраўнік Маскоўскага музычна-драматычнага цыганскага тэатра «Рамэн», народны артыст СССР (1981). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1987).

1939 год — нарадзіўся Эмануіл Гедэонавіч Вітарган, расійскі акцёр тэатра і кіно, рэжысёр, народны артыст Расіі. Здымаўся ў фільмах «І гэта ўсё пра яго», «Чарадзеі», «Місія ў Кабуле» і іншых.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	16.53	7.25
Віцебск —	9.25	16.35	7.10
Магілёў —	9.18	16.43	7.25
Гомель —	9.06	16.48	7.42
Гродна —	9.42	17.10	7.28
Брэст —	9.34	17.19	7.45

Месяц

Апошняя квадра
19 снежня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Калініка, Мікалая, Філімона.*
К. *Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Што нашаму чалавеку добра, тое раніцай дрэнна.

— Дзяўчына, гэта не вы ўчора на карпаратыве танцавалі ў адной ніжняй бялізне?

— Я? У ніжняй бялізне? Вы, напэўна, рана сышлі.

Памятаеце гісторыю, калі Ісландыя прапаноўвала 5000 еўра ў месяц мужчынам, якія прыедуць і будуць жаніцца з мясцовымі дзяўчынамі? Дык вось, я адпраўляў сваю анкету, і мне нядаўна прыйшоў адказ. Аказваецца, ісландкі самі прапанавалі ўраду 5000 еўра, абы я толькі не прыязджаў.

— На якім тэрміне вы адчулі варушэнне дзіцяці?

— Калі яно ўладкавалася на работу і стала жыць асобна.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4276.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

27 снежня 2019 г. № 51 (536)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БЕЛАЗ, КІНАТУРЫЗМ І ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ЗОНА

У Беларусі з'яўляюцца новыя месцы, якія прываблівaюць турыстаў

За 11 сёлетніх месяцаў у нашу краіну праз міжнародныя пункты пропуску ўехала больш за 4,5 мільёна іншаземцаў. Чакаецца, што па выніках года гэтая лічба наблізіцца да пяцімільённай мяжы. Традыцыйна найбольш папулярнымі з'яўляюцца наземныя віды транспарту: так, аўтамабільным транспартам у Беларусь уехала амаль 3,2 мільёна іншаземцаў, чыгуначным — 611 тысяч, авіятранспартам у краіну прыбыла больш за 660 тысяч. Самымі папулярнымі месцамі ў нашай краіне з'яўляюцца чатыры аб'екты, унесеныя ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Сярод іх жамчужыны беларускай архітэктуры — Мірскі і Нясвіжскі замкі, а таксама Белавежская пушча і элементы геадэзічнай дугі Струвэ. Беларускіх аб'ектаў, якімі цікавяцца турысты, становіцца з кожным годам усё больш, таму з'яўляюцца новыя віды турызму. Пра гэтыя новыя віды, праблемныя пытанні ў сферы і перспектывы мы пагаварылі з намеснікам дырэктара Дэпартамента па турызме Віталём ГРЫЦЭВІЧАМ.

стар. 4, 13

ЧЫСТАЯ ВАДА

БЕЗ ЖАЛЕЗА І ІНШЫХ ПРЫМЕСЯЎ

Калі ў сельскай мясцовасці вырашацца праблемы з пітной вадой?

Да 2025 года ў сельскай мясцовасці плануецца пабудаваць 1400 станцый абезжалезвання вады. У іх маюць патрэбу невялікія населеныя пункты, дзе жыве ад 200 да 500 чалавек. Гэта дазволіць забяспечыць усё насельніцтва краіны якаснай пітной вадой.

Будаваць па 250 станцый у год

Яшчэ летась аблвыканкамы сумесна з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі ацанілі сістэмы водазабеспячэння па ўсёй краіне.

— Вызначана 1400 населеных пунктаў, дзе будуць будавацца станцыі абезжалезвання. Яшчэ 300 плануецца забяспечыць водазаборнымі свідравінамі, а 180 — перападключыць да населеных пунктаў з якаснай пітной вадой, — адзначае **кансультант аддзела вадаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Ірына САЛІВОНЧЫК.**

У 2019 годзе вялося будаўніцтва 250 станцый абезжалезвання. На гэта выдаткаваны сродкі рэспубліканскага і абласных бюджэтаў.

стар. 16

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Нашы дзеці

Як праходзіць аднайменная рэспубліканская дабрачынная акцыя ў краіне.

стар. 3

У Клімавічы ці на Мальдывы?

У райцэнтры распрацоўваюць унікальны прыродны маршрут, які прывабіць шматлікіх гасцей.

стар. 4

Навацыі ў турындустрыі

Праект абноўленага закона «Аб турызме» плануецца ўнесці на разгляд у парламент у 2020 годзе.

стар. 13

Новы імпульс «бязвізу»

Бязвізавая зона пашыраецца, але ёсць праблемы, лічаць эксперты.

стар. 13

Палац і заасад

Рэзерваў для развіцця турызму на Ружаншчыне, што ў Брэсцкай вобласці, яшчэ шмат.

стар. 14

НА КАНТРОЛІ

ЦЭНЫ. ЗАНЯТАСЦЬ. ЗАРПЛАТА

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у сесіі Віцебскага аблсавета. Яна падзялілася думкамі наконт эфектыўнасці дзейнасці мясцовай улады Віцебшчыны, падкрэсліла, якія задачы ў першую чаргу павінны вырашацца дэпутатамі і ўсімі, хто кіруе калектывамі. Сярод прысутных былі народныя выбраннікі розных узроўняў: ад сельскіх Саветаў да Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу і Савета.

Са справаздачай выступіў **старшыня Мікалай ШАРСНЁЎ,** які паведаміў аб сёлетніх выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, агучыў планы на 2020 год.

Акцэнт ён зрабіў на тым, што бюджэт паранейшаму застаецца сацыяльна накіраваным: у агульным аб'ёме расходаў 66,7 % на «сацыялку» — 2 мільярды 468 мільёнаў 450 тысяч рублёў.

— У цэлым у вобласці захавана стабільная абстаноўка, забяспечана станоўчая дынаміка ў сацыяльнай і вытворчай сферах, — падкрэсліў старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Не дапушчаны рост узроўню рэгістраванага беспрацоўя. Знізіўся ўзровень напружанасці на рынку працы (на 0,1) і колькасць беспрацоўных (на 23 %). А колькасць вакансій павялічылася на 21 %. За кошт стварэння новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў за 2016—2018 гады заданне па працаўладкаваных перавыканана больш чым на тры тысячы чалавек. Толькі сёлета атрымалі работу 6,5 тысячы чалавек, а за бягучую пяцігодку — 32 тысячы...

Захоўваецца станоўчая дынаміка росту сярэднямесячнай заработнай платы, якая склала за студзень—кастрычнік 905 рублёў, што больш, чым летась, на 13 %. Сярэдняя заработная плата перавысіла тысячу рублёў у прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, інфармацыі і сувязі.

Сёлета на фінансаванне аховы здароўя выдаткоўваецца чвэрць бюджэту вобласці. Выкананы асноўныя паказчыкі дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь», забяспечваюцца ўсе сацыяльныя стандарты.

Чаканая працягласць жыцця насельніцтва ў параўнанні з 2010 годам павялічылася на 4,3 года — да 73,8 года. Адсутнічае мацярынская смяротнасць. Удзельная вага жыхароў, якія памерлі ў працаздольным узросце, у структуры смяротнасці працягвае заставацца самай нізкай у краіне. Даходы ад пазабюджэтнай дзейнасці ўстаноў аховы здароўя склалі 63 мільёны рублёў — на 9 % больш, чым летась.

Губернатар падрабязна расказаў пра тое, што робіцца ў галіне адукацыі. У прыватнасці, працягваецца работа па павышэнні эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці ўстаноў, у тым ліку за кошт аптымізацыі. Дзякуючы эканоміі добра ўмацоўваецца матэрыяльная база.

За чатыры гады на гэтыя мэты накіравана больш за 130 мільёнаў рублёў. Доля капітальных выдаткаў і на бягучы рамонт сёлета да ўзроўню 2016 года ўзрасла ў тры разы і склала 7 %, або 48 мільёнаў рублёў.

Працягваецца стварэнне «Школ будучыні». Сёлета гэты праект рэалізаваны ў Браслаўскай сярэдняй школе № 2. У рамках праграмы развіцця малых гарадоў выкананы рамонт устаноў адукацыі ў гарадскіх пасёлках Езярышча, Багушэўск, Бягомль...

Мікалай Шарснёў таксама агучыў дасягненні ў галінах культуры, спорту і турызму, ЖКГ, рамонту дарог і іншых.

Наталля Качанава адзначыла, што зробленае ў пытаннях сацыяльнай сферы заслугоўвае станоўчай ацэнкі. Але яшчэ ёсць над чым працаваць, да чаго імкнуцца, дзе рабіць работу над памылкамі...

Спікер Савета Рэспублікі канстатавала, што вобласць не дацягвае па такім паказчыку, як рост сярэдняй заработнай платы. 1000 рублёў у месяц — для Прыдзвіння дасягальны ўзровень, бо патэнцыял ёсць сур'ёзны, падкрэсліла яна. І кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў павінны забяспечыць людзей работай з добрым заробкам.

Кіраўнік верхняй палаты парламента нагадала, што на першым плане — стан эканомікі. Трэба не забываць пра тое, што

Фота БелТА.

Прэзідэнт патрабаваў ад адказных асоб: заўсёды кантраляваць цэны, занятасць, зарплату.

Наталля Качанава нагадала, што ў кіраўніцтва вобласці вельмі сур'ёзныя задачы. Сярод іншага гэта і «перазагрузка» Аршанскага рэгіёна, рэалізацыя праграмы паскоранага развіцця гарадоў з насельніцтвам больш за 80 тысяч чалавек — Оршы, Полацка і Наваполацка.

— Сур'ёзна давядзецца тут працаваць, таму што гэта пілотныя праекты, якія затым трэба рэалізоўваць ва ўсіх гарадах краіны, незалежна ад колькасці жыхароў. Сур'ёзныя задачы і ў пытанні развіцця агрампрамысловага комплексу, над якім сёння працуюць аблвыканкам і ўрад, каб вырашыць тыя задачы, якія паставіў Прэзідэнт у Віцебску на нарадзе па развіцці агрампрамысловага комплексу, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што кожны, хто працуе ў органах мясцовай улады, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый павінны разумець, што асабіста нясуць адказнасць за выкананне пастаўленых кіраўніком краіны задач. Прэзідэнт, паводле яе слоў, ніводную прапанову ад імя Віцебскага аблвыканкама не пакінуў без разгляду.

— І ўсе прапановы, якія датычацца развіцця вобласці, падтрыманы Прэзідэнтам. Кажу гэта дакладна, бо, як вы ведаеце, яшчэ зусім нядаўна працавала кіраўніком яго Адміністрацыі. Ён вельмі пільную ўвагу ўдзяляе развіццю вобласці, таму што пытанняў, якія трэба вырашаць, тут больш чым дастаткова, — сказала старшыня Савета Рэспублікі.

Яна станоўча ацаніла вопыт Віцебшчыны ў рабоце з людзьмі. Але гэтую працу дэпутацкага корпуса неабходна актывізаваць у 2020-м. Трэба расказаць землякам пра тое, што робіць улада для захавання суверэнітэту краіны, не забываючы клапаціцца пра паляпшэнне дабрабыту грамадзян. І трэба мець на ўвазе яшчэ адну важную задачу, пастаўленую Прэзідэнтам: каб ва ўсёй краіне былі створаны роўныя ўмовы.

Калі будзе ўсё неабходнае для камфортнага жыцця, добрая праца, людзі не будуць пакідаць родныя мясціны ў пошуках лепшай долі — у буйных гарадах, сталіцы, за мяжой...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Эканоміка з сацыяльным падтэкстам

Старшыня Савета Рэспублікі працягвае знаёмства з дэпутацкім корпусам рэгіёнаў. Чарговая сустрэча Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылася на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Парадак дня сесіі быў даволі насычаны: 15 пытанняў, і ўсе ў той ці іншай ступені датычыліся жыхароў сталіцы ў наступным годзе. Ключавымі пытаннямі сталі прыняцце бюджэту і інвестыцыйнай праграмы на 2020 год. Наталля Качанава ўзяла актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтых чыста эканамічных дакументаў. Яе заўвагі, парады, заявы і нават патрабаванні былі з сацыяльным падтэкстам. Напрыклад, аб тым, што ніхто з працаўнікоў бюджэтнай сферы налета не павінен атрымліваць меншую зарплату, чым у 2019 годзе. Гэтае пытанне Наталля Качанава рэкамендавала дэпутатам вельмі жорстка кантраляваць і рашуча абвяргаць чуткі пра нібыта маючае хутка адбыцца змяншэнне заробкаў. Як і беспадстаўныя і нават шкодныя (інакш не скажаш) размовы пра тое, што дэкрэтны адпачынак скароцяць да двух гадоў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

> Пры ўсёй разнастайнасці абавязкаў дэпутатаў, на думку старшыні Савета Рэспублікі, прыярытэтам іх дзейнасці быў і застаецца дыялог з грамадзянамі па праблемных пытаннях. Больш за тое, яна параіла дыялог актывізаваць.

Вядома, пагадзілася яна, у аснове ўсяго ляжыць эканамічнае развіццё. Бо напаўненне бюджэту, а значыць, і вырашэнне сацыяльных пытанняў, залежыць ад эфектыўнай работы прадпрыемстваў. Калі яны працуюць паспяхова, значыць, будзе сфарміраваны бюджэт, што дазволіць выконваць задачы, якія сёння стаяць перад Мінскам.

Па словах Наталлі Качанавай, 2020 год будзе вельмі насычаны. У першую чаргу гэта завяршэнне пяцігодкі. Наперадзе сур'ёзная работа па выкананні заданняў і прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. А тут яшчэ падрыхтоўка планаў на новае пяцігоддзе, святкаванне 75-годдзя Вялікай Перамогі і многае іншае.

Разам з тым спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што пры ўсёй бясспрэчнай важнасці першачарговых эканамічных задач іх трэба вырашаць з абавязковым улікам надзённых клопатаў і патрэб жыхароў таго ці іншага мікрараёна. Гэта могуць быць перапоўненыя смеццевыя кантэйнеры на дваровых тэрыторыях, няякасныя прадукты харчавання ў крамах ці нешта іншае. Само сабой зразумела, што гараджан хвалююць капітальны рамонт жылфонду, будаўніцтва дашкольных устаноў і школ, развіццё інфраструктуры, стан інжынерна-транспартных камунікацый, добраўпарадкаванне і азеляненне гарадской тэрыторыі. На асаблівым кантролі павінны быць аб'екты звышнарматыўнага будаўніцтва, завяршэнне даўгабудаў, забеспячэнне жыллём шматдзетных сем'яў.

Таму, пры ўсёй разнастайнасці абавязкаў дэпутатаў, на думку старшыні Савета Рэспублікі, прыярытэтам іх дзейнасці быў і застаецца дыялог з грамадзянамі па праблемных пытаннях. Больш за тое, яна параіла дыялог актывізаваць. А для гэтага варта «ўключыцца ў работу па інфармаванні насельніцтва па пытаннях унутранай палітыкі, чуць людзей, быць уважлівымі да кожнага звароту», — сказала Наталля Качанава. Формы работы з насельніцтвам могуць быць розныя: прыёмы па асабістых пытаннях, прамыя тэлефонныя лініі і г. д. Таксама важнымі з'яўляюцца рэгулярныя сустрэчы з выбаршчыкамі ў калектывах і акругах.

Увагу спікер верхняй палаты парламента звярнула і на работу са сродкамі масавай інфармацыі. Тут у дэпутатаў гарсавета вялікія рэзервы і, шчыра скажам, ёсць відавочныя хібы. Наталля Качанава, здаецца, невыпадкова сказала пра актуальнасць своечасовага інфармавання насельніцтва праз сродкі масавай інфармацыі. Бо жыццё імкліва змяняецца, узнікаюць новыя пагрозы і выклікі. Перад дэпутацкім корпусам стаіць важная задача аператыўна даводзіць да мінчан свежую і аб'ектыўную інфармацыю аб унутранай і знешняй палітыцы дзяржавы, у тым ліку і праз СМІ. І тут ёсць што сказаць людзям, яны павінны быць інфармаваныя праз дэпутатаў, упэўнена старшыня Савета Рэспублікі.

Тады можа зменшыцца колькасць зваротаў (а іх даволі шмат) жыхароў Мінска ў вышэйшыя органы ўлады краіны.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

АКЦЫЯ «НАШЫ ДЗЕЦІ»

КЛОПАТ ПРА ТЫХ, ХТО МАЕ ПАТРЭБУ Ў ДАПАМОЗЕ І ПАДТРЫМЦЫ

Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» патрэбна як дзецям, так і дарослым. Апошнім важна ў сваіх штодзённых клопатах памятаць пра тых, каму неабходныя дапамога і падтрымка.

Такую думку выказала журналістам **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** пасля навагодняга свята, якое стала часткай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Наваполацка, паведамляе БелТА.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла важнасць такой акцыі. «У гэтыя святочныя дні мы традыцыйна сустракаемся з дзецьмі. Падобныя акцыі, мерапрыемствы патрэбныя як малым, так і дарослым, таму што ў такіх тэрытарыяльных цэнтрах сапраўднае жыццё, тут мы адчуваем наш клопат пра дзяцей», — сказала старшыня Савета Рэспублікі.

«З вялікай радасцю знаходжуся сёння ў гэтым тэрытарыяльным цэнтры, які ў свой час стварылі. Убачыла знаёмых дзяцей, іх дасягненні. З імі цікава мець зносіны, іх рэакцыя шчырая і непадкупная. Яны мяне заўсёды віншуюць з Новым годам і перадаюць сувеніры, якія зрабілі сваімі рукамі», — адзначыла спікер верхняй палаты.

У цэнтры некалькі гадоў таму па ініцыятыве Наталлі Качанавай (тады яна ўзначальвала мясцовы гарвыканкам) былі створаны мэтавыя групы, куды бацькі на час работы маглі прывесці сваіх дзяцей з асаблівасцямі. Гэтая ідэя аказалася запатрабаванай. «Я рада, што працуючы, бацькі могуць рэалізаваць свае магчымасці, бо няпроста пакінуць такое дзіця дома», — дадала яна.

У ТЦСАН Наваполацка дзейнічаюць шэсць аддзяленняў, у тым ліку для дзённага знаходжання інвалідаў. Сёлета яму споўнілася 10 гадоў. У аддзяленні займаюцца 53 чалавекі. Тут для іх арганізаваны гурткі па дэкаратыўнай творчасці, рухальнай рэабілітацыі, навучанню камп'ютарнай адукаванасці, музычна-тэатральны гурток. Ёсць у цэнтры магчымасць прайсці колерамузычную тэрапію, таксама інваліды ў якасці валанцёраў бываюць у прытулку для жывёл, для іх гэта яшчэ і рэабілітацыя.

Фота БелТА.

Дарэчы, навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» будзе доўжыцца да 10 студзеня. Дабрачынны марафон праходзіць пад патранатам Аляксандра Лукашэнкі. Падчас акцыі кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, мясцовых органаў улады наведваюць дзіцячыя інтэрнаты і дамы сямейнага тыпу, апякунскія і прыёмныя сем'і, сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, бальніцы. Яны віншуюць дзяцей з Новым годам і Калядамі, робяць ім падарункі, дапамагаюць у вырашэнні праблем.

ТРОХІ ДУШЭЎНАЙ ЦЕПЛЫНІ Ў ЗМРОЧНЫ ДЗЕНЬ

26 снежня ў мінскім дзіцячым доме № 5 прайшла навагодняя рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Да яго выхаванцаў завіталі прадстаўнікі Савета Рэспублікі на чале з **намеснікам старшыні верхняй палаты парламента Анатолем ІСАЧАНКАМ.** Ён цёпла павіншаваў дзяцей з надыходзячым навагоднім святам, пажадаў ім выканання ўсіх іх мар і спадзяванняў.

Адчувалася, што дзеці рады гасцям. І не толькі таму, што ўчора пачаліся зімовыя школьныя канікулы, або таму, што госці прыехалі не з пустымі рукамі. Пэўна, прычынай было тое, што маленькім жыхарам гэтага тыповага будынка падарылі яшчэ і трохі сардэчнай цеплыні, якой ім вельмі не хапала ў ранейшым жыцці. Зразумела, дзецям дужа спадабаліся падарункі: госці, акрамя традыцыйных цукерак, прывезлі яшчэ і шэсць планшэтных камп'ютараў.

Гасцям паказалі, як жывуць выхаванцы дзіцячага дома, дзе яны вучацца, займаюцца фізічнай культурай, адпачываюць, дзе, як і чым харчуюцца. Меню сталоўкі было разнастайнае і паўнавартаснае. Гасцям у спартыўнай зале хлопчыкі прадэманстравалі сваё ўменне на скаладроме. Яго, дарэчы, падарылі прадстаўнікі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў час мінулай навагодняй рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

Нагадаем, дзіцячы дом працуе ў рэжыме кругласутачнага знаходжання дзяцей. Сёння тут жыве 61 выхаванец. Гэта дзяўчынкі і хлопчыкі ва ўзросце ад 4 да 17 гадоў. Яны падзелены на восем груп. Незалежна ад узросту ў кожнага з выхаванцаў свая, і часам вельмі няпростая, біяграфія, поўная хатняга гвалту і несправядлівасці. Нярэдка гэта сіроцтва пры жывых бацьках.

А завяршылася гэтая нефармальная пераднавагодняя сустрэча агульным чаяваннем пасля невялікага канцэрта, які падрыхтавалі дзеці.

Леанід ТУГАРЫН.

СУСТРЭЧА З ЦУДАМ І ДОБРЫМІ СЭРЦАМІ

У дзённым цэнтры для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, што ў Гродне, зладзілі навагоднее свята ў рамках акцыі «Нашы дзеці»

Валанцёры і супрацоўнікі Гродзенскай абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа падрыхтавалі інтэрактыўную праграму. А падарункі ўручыў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі, старшыня прэзідыума абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Дзённы цэнтр для дзяцей з асаблівасцямі месціцца ў былым дзіцячым садку. Памяшканне пакуль не вельмі прыстасавана для тых, хто знаходзіцца ў каляскach, але, як расказала кіраўнік цэнтра Інеса Ларыёнава, налета тут будзе зроблены рамонт, а на другі паверх усталяваны пад'ёмнік. Гэта дазволіць у значнай ступені разгрузіць першы паверх і пашырыць праграму заняткаў.

На свята большасць дзетак цэнтра прыехала на аўтамабілі, які абслугоўвае менавіта падапечных Чырвонага Крыжа. У наступным годзе мяркуюць набыць спецыяльны транспарт з пад'ёмным механізмам, каб было зручна транспартаваць дзяцей, якія знаходзяцца ў інвалідных каляскach. Такі падарунак забяспечвае ўдзел у трансгранічнай праграме.

— Цяпер ідзе актыўны збор сродкаў і падарункаў у рамках акцыі «Ёлка жаданняў». Летась да яе далучыліся амаль 400 валанцёраў. Тады акрамя падарункаў удалося сабраць 13 тысяч рублёў. На гэтыя сродкі абласная арганізацыя Чырвонага Крыжа змагла набыць падарункі яшчэ для паўтары тысячы дзяцей, — адзначыў Віктар Лісковіч. — Мяркую, што сёлета гэта лічба павялічыцца, пра што сведчыць першы этап акцыі «Нашы дзеці».

Але не толькі салодкімі пачастункамі радуе дзетак Чырвоны Крыж. Адрасную дапамогу атрымоўваюць амаль 16 тысяч жыхароў рэгіёна.

Цяпер абласная арганізацыя бярэ ўдзел у 15 гуманітарных праектах агульным коштам паўмільёна долараў. Гэта і новы мікрааўтобус, і рамонт самога будынка, і дадатковыя сродкі на розныя паслугі, у тым ліку паліятыўныя.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Арганізаванасць памнажае сілы

У сваім выступленні напрыканцы першай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання яго старшыня Наталля Качанава заўважыла, што зараз у завяршальнай стадыі знаходзіцца канчатковае фарміраванне планаў работы як верхняй палаты парламента, так і яе пастаянных камісій. На іх плечы ляжа асноўны цяжар наладжвання эфектыўнай дзейнасці Савета Рэспублікі ў цэлым.

Многае ў гэтай справе будзе залежаць ад тых, хто ўваходзіць у камісіі, і тых, каму члены Савета Рэспублікі даручылі іх узначальваць. Пра выбранне старшынь пастаянных камісій мы ўжо расказвалі. Цяпер — пра іх намеснікаў, якіх зацвердзілі ў ходзе работы першай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання.

Намеснікамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве абралі сенатараў Аляксандра Бачылу і Віктара Чайчыца.

Намеснікамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах абралі сенатараў Віктара Ананіча, Дзмітрыя Дзямідава і Ірыну Ляўковіч.

Намеснікамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці абралі сенатараў Віктара Снежыцкага, Андрэя Іванца і Алега Суконку.

Намеснікамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні абралі сенатараў Марыну Ільіну, Уладзіміра Лук'янава і Алега Портніка.

Намеснікамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы абралі сенатараў Валерыя Гайдукевіча і Андрэя Русакевіча.

Леанід ТУГАРЫН.

ЭКАНОМІКА

ІНВЕСТПРАЕКТ ПАД ПІЛЬНАЙ УВАГАЙ

Тэрміны мадэрнізацыі ААТ «Нафтан» павінны быць вытрыманыя

На прадпрыемстве прайшло пасяджэнне назіральнага савета, у якім узяла ўдзел яго старшыня Наталля Качанава.

На сустрэчы былі разгледжаны пытанні развіцця «Нафтана». Закранулі і тэму рэалізацыі праектаў па яго мадэрнізацыі. «Гэта вельмі важна. Зусім нядаўна ў Прэзідэнта была нарада па інвестыцыйных праектах. Мадэрнізацыя завода «Нафтан» — адзін з сур'ёзных інвестпраектаў, і тыя тэрміны, якія былі ўстаноўлены падчас наведвання завода Аляксандрам Лукашэнкам, павінны быць вытрыманыя», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Паводле яе слоў, па выніках работы за дзевяць месяцаў і ў трэцім квартале прадпрыемства выканала прагнозныя паказчыкі. «Як будзе складвацца наступны год для завода, будзе залежаць ад дамоўленасцяў, дасягнутых у перагаворах з расійскімі калегамі. Спадзяюся, што ўсё будзе добра, бо «Нафтан» — важнае прадпрыемства для эканомікі краіны і горада», — дадала Наталля Качанава.

Паводле БелТА.

ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

ЕДЗЕМ НА КЛІМАВІЦКІЯ МАЛЬДЫВЫ!

У райцэнтры распрацоўваюць унікальны прыродны маршрут, які, як тут спадзяюцца, прывабіць шматлікіх гасцей

Мелавыя кар'еры ў Клімавічах — і сёння адно з самых найлепшых месцаў адпачынку. Вада ў іх незвычайнага блакітна-смарагдавага колеру. Ды і рэльеф цудоўны. Лес, азёры, выспы — глядзіш і дух захоплівае. У інтэрнэце клімавіцкія кар'еры пазіцыянуюцца як адзін з пяці найпрыгажэйшых прыродных аб'ектаў Беларусі. На жаль, месца пакуль не «раскручанае». Але, як расказалі карэспандэнту «МС» у Клімавіцкім райвыканкаме, усё яшчэ наперадзе.

Знаходзяцца гэтыя прыгожыя мясціны за некалькі кіламетраў ад горада: выязджаеш і пайшла чарада кар'ераў — чатыры вялікія азёры і шмат маленькіх. Пры жаданні пабываць там можна без праблем. Для гэтага ёсць прыватны грамадскі транспарт.

— Раней у кар'ерах здабывалі для сваіх патрэб пясок і мел вапнавы і цагельны заводы, а калі прадпрыемствы закрыліся, гэтыя месцы адкарэктавала прырода. Грунтовыя воды падняліся, і ўтварылася ўся гэтая прыгажосць. Там ёсць і пясчаныя кар'еры, і мелавыя, — кажа **загадчык сектара спорту і турызму Клімавіцкага райвыканкама Равіль САБІРАЎ.**

— Гэта нашы клімавіцкія Мальдывы, можаце мне паверыць, — запэўнівае **галоўны спецыяліст сектара Аляксандр ЧАБАН.** — Я быў на сапраўдных Мальдывах і кажу з поўнай адказнасцю: нашы нічым не горшыя — такія ж белыя горы, блакітная вада. Спалучэнне наогул незвычайнае. Засталося знайсці спонсара, які надасць гэтаму дыяменту годную агранку. Месца проста шыкоўнае.

Пакуль ідэя толькі прапрацоўваецца, шукаюцца крыніцы фінансавання. Перш за ўсё спатрэбіцца зрабіць там зону адпачынку, праверыць дно кар'ераў. Дарэчы, глыбіня іх да 15 метраў. Купацца там забаронена. Самастойна райвыканкаму такія маштабы не пацягнуць, таму інфармацыя ўкладваецца ў вушы прадпрымальных людзей. Пакуль безвынікова.

— Калі знойдуцца ахвотныя прыехаць паглядзець на гэтую прыгажосць летам, наш Цэнтр здароўя можа даць палатку, спальны мяшок, іншую амуніцыю, — кажа загадчык сектара. — Гэта самае малое, што мы пакуль можам прапанаваць. Хацелася б, каб месца стала больш даступнае не толькі для жыхароў Клімаўшчыны, але і для ўсіх. Нават на карцінках яно выглядае чароўна. А ўяўляеце, як прыгожа на месцы? Можна было б наогул зрабіць цікавы водны маршрут — аб'яднаць клімавіцкія кар'еры з крычаўскімі, да якіх недзе 30 кіламетраў.

Сёння можна камфортна адпачыць у Доме паляўнічага каля вёскі Бліунг. Ад Клімавіч гэта кіламетраў сем. Там ёсць сцежка здароўя, сажалка, альтанкі, масток, які вядзе ўглыб возера.

Дарэчы, месца гэтае з цікавай гісторыяй. Калісьці тут быў Свірэльскі маёнтак і фальварак багатага яўрэя Блеўна. У часы Кацярыны Вялікай гаспадар быў сасланы, а маёнтак перайшоў пану Шацкаму. Пасля рэвалюцыі тут была створана камуна, але назва Бліунг захавалася. Маёнтка больш няма, але мясціны выдатныя.



Равіль САБІРАЎ дэманструе клімавіцкія Мальдывы.

— Тут вельмі любяць адпачываць расіяне, — кажа Равіль Сабіраў. — Хутка зноў да нас прыедуць, будуць тут паляваць. Наогул паляўнічы турызм развіты ў нас вельмі добра. Гэта і грошы для раёна, і імідж для краіны.

Клімавічы ведаюць таксама і як сталіцу міжнароднага дзіцячага фестывалю «Залатая пчолка». На свята, якое праводзіцца ў Міжнародны дзень абароны дзяцей, з'язджаецца шмат народу, у тым ліку з блізкіх раёнаў Расіі — Шумяцкага і Рослаўльскага. Дарэчы, Клімавічы — адзін з нямногіх райцэнтраў, якія могуць пахваліцца сапраўды камфортнай гасцініцай у цэнтры горада.

Але мала хто ведае, што Клімавічы калісьці былі яшчэ і лыжнай сталіцай. І сектар спорту і турызму марыць адрадзіць гэтыя традыцыі. Тым больш што гэта ў міжнародных інтарэсах.

— Мы вельмі добра супрацоўнічаем з Расійскай Федэрацыяй, — расказвае Аляксандр Чабан. — Запрашаем іх да сябе ў госці, самі ездзім. З нашымі лыжнікамі займаецца заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Віктар Шапораў. Нам не хапае спартыўнага комплексу. Мы марым пра лыжароллерную трасу, хоць невялічкую — як зрабілі ў расійскім гарадку Прудок Рослаўльскага раёна. У нас адораных дзяцей хапае — у Клімавічах ганарацца сваімі спартыўнымі зоркамі. У іх ліку сярэбраны прызёр чэмпіянату свету Юрый Астапенка, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў па біятлоне Вячаслаў Талкачоў. Але вельмі складана трэніраваць будучых зорак, калі няма ўмоў. Дзіцячая спартыўная школа мае толькі адзін стадыён — там табе і валейбольнае поле, і баскетбольнае, і турнікі. А быў бы спартыўны комплекс, можна было б расіян запрашаць, валюту зарабляць. Трэнерскія кадры ў нас моцныя, і вынікі ёсць. Можна было б і іншыя віды спорту культываваць.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

БЕЛАЗ, КІНАТУРЫЗМ

Пагоня за ўражаннямі

Кажучы пра ўязны турызм у Беларусі, усе прывыклі лічыць традыцыйнымі яго відамі культурна-пазнавальны, аздараўленчы і аграгурызм, аднак апошнія пару гадоў у краіне пачалі актыўна развівацца і новыя віды. Сярод іх, напрыклад, прамысловы турызм, які здабыў вялікую папулярнасць як сярод замежнікаў, так і сярод беларусаў.

— Каля 120 прадпрыемстваў сёння праводзяць экскурсіі па сваіх тэрыторыях. Гэта не звыклыя экскурсіі з мэтай прафарыентацыі для студэнтаў: яны створаны менавіта для турыстаў, — расказвае Віталь Валер'евіч. — Флагманам у гэтым кірунку з'яўляецца БелАЗ. Для многіх цікава сфатаграфавацца на фоне 450-тонніка або пакатацца на ім. Асобна можна сказаць і пра Мінскі трактарны завод: у рамках наведвання гэтага прадпрыемства турыст можа не толькі паглядзець экспазіцыю, пракаціцца на трактары, але яшчэ і паўдзельнічаць у яго зборцы. Пасля чаго ён атрымлівае сертыфікат, які пацвярджае, што трактар з пэўным нумарам, які праз два месяцы адправіцца, скажам, у Эфіопію, сабраны яго рукамі. Людзі сёння імкнуцца па ўражанні, ім гэта падабаецца, таму такія экскурсіі карыстаюцца попытам.

У прамысловым турызме таксама традыцыйнай папулярнасцю карыстаецца наша харчовая прамысловасць — такія прадпрыемствы, як «Камунарка» або «Слодыч».

— Вельмі цікавыя экскурсіі прапануе завод «Аліварыя»: яны абсталявалі прадпрыемства аўдыягідамі, тураператары па просьбе гасцей уключаюць гэтыя экскурсіі на завод у пакет аглядных па Мінску.

Віталь Валер'евіч таксама адзначае, што нядаўна ў Беларусі адкрылі кінатурызм. Беларуская нацыянальная студыя «Беларусьфільм» праводзіць у сябе экскурсіі, дзе можна паглядзець розныя дэкарацыі і прымераць касцюмы любімых герояў «з тэлевізара».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Першыя ў сусветным рэйтынгу

Новы імпульс атрымаў і экалагічны турызм: нягледзячы на тое што ўжо даўно стаў традыцыйным, ён працягвае развівацца ў новых варыянтах з пункту гледжання аказання паслуг.

— Напрыклад, у некаторых нацыянальных парках вельмі папулярнай стала хада па балотах. Турысты прыязджаюць у Беларусь, каб паслухаць спевы птушак, сфатаграфаваць зубра ці таго ж ваўка на фотапасткі. Гэта не так запатрабавана ў расіян, як у еўрапейцаў, — расказвае Віталь Грыцэвіч. — Наогул для аматараў экалагічнага турызму адпачынак у Беларусі — унікальная магчымасць атрымаць асалоду ад прыроды ў экалагічна чыстых, не кранутых урбанізацыяй кутках. Многія прыродныя аб'екты краіны лічацца эксклюзіўнымі ў Еўропе. У першую чаргу гэта нацыянальныя паркі «Нарачанскі», «Прыпяцкі», «Браслаўскія азёры», «Белавежская пушча», Бярэзінскі біясферны запаведнік, заказнікі «Налібоцкая пушча», «Блакітныя азёры» і многія іншыя. Незвычайным месцам з'яўляецца і Бярэзінскі запаведнік — адзінае месца ў Еўропе, дзе на адной кампактнай тэрыторыі ў дзікіх умовах жыве «Вялікая еўрапейская пяцёрка» млекакормячых: лось, зубр, мядзведзь, воўк і рысь. Вялікую папулярнасць набірае і чарнобыльская зона.

Адна з ужо вядомых «фішак» Беларусі — аграгурызм. Рускамоўная версія часопіса National Geographic ужо некалькі гадоў запар прызнае нашу краіну найлепшай у адпаведнай намінацыі. Беларусь абагнала ў гэтым відзе турызму Італію і Францыю.

— Нават калі не браць рэйтынгі, пра нашы дасягненні ў гэтай сферы сведчыць той факт, што генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі (ЮНВТО) Зураб Палалікашвілі, прыехаўшы ў Беларусь у чэрвені, заявіў, што ЮНВТО плануе 2020 год абвясціць годам агра- і экатурызму, а канферэнцыя, прысвечаная гэтай падзеі, пройдзе менавіта ў Мінску — у маі наступнага года. Гэта паказчык таго, што на сусветным узроўні Беларусь прызнана ў сферы аграгурызму, — кажа сураз-моўнік і дадае, што ў гэтым кірунку, нягледзячы на паспяховае развіццё, існуюць і праблемныя моманты. — Аграгурызм развіваецца дзякуючы ўказу Прэзідэнта, які дзейнічае яшчэ з 2008 года. Два гады таму ў дакумент былі ўнесены змены, якія адрэгулявалі дзейнасць суб'ектаў аграгурызму, дзяржава дала для іх дадатковыя магчымасці, але нам яшчэ ёсць над чым працаваць.

Віталь Валер'евіч адзначае, што аграгурызм у Беларусі мае разнастайныя спецыялізацыі. Адны аграсядзібы канцэнтруюцца на гастраноміі — гаспадары збіраюць рэцэпты, гатуюць стравы, якімі частуюць гасцей. Другія паказваюць народныя абрады, традыцыі і праводзяць цэлыя фэсты, трэція спецыялізуюцца на актыўным адпачынку, арганізуюць сплавы і даюць месцы для палатак.

Працягвае развівацца ў краіне і гастранамічны турызм, хоць і не такімі актыўнымі тэмпамі. Віталь Грыцэвіч адзначае, што, нягледзячы на некаторыя дасягненні, ад сусветнага ўзроўню Беларусь пакуль значна адстае.

— Сёлета тры беларускія прадстаўнікі занялі прызавыя месцы ў конкурсе сярод барменаў. Апошнім часам рэстараннае культура павышаецца. Безумоўна, трэба запрашаць у Беларусь больш ку-

> У краіне функцыянуе больш за 150 музейных устаноў, самымі наведвальнымі з якіх з'яўляюцца музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Брэсцкая крэпасць-герой», музей-запаведнік «Нясвіж», Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, музей «Замкавы комплекс «Мір».

У МІНУЛАЕ

Віцебская вобласць мяжуе як з ЕС, так і з Расіяй. З улікам гэтага можна вельмі добра зарабляць на турызме. Менавіта такі бізнес стаў для заходніх суседзяў «фішкай» для развіцця вёсак і гарадкоў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. У Віцебшчыны таксама нямала прыемных нюансаў, якія робяць яе вельмі прыцягальнай для наведвання.

Напрыклад, менавіта тут знаходзіцца самы старажытны горад нашай краіны — Полацк. І, дарэчы, тутэйшыя — у авангардзе рэалізацыі турыстычных праектаў. У адным з сельсаветаў паспяхова арганізоўваюць катанне на паветраным шары. Аматары «гуляць у мінулае» з клуба рэканструкцыі могуць не толькі паказаць на фэстах, як ваявалі, танцавалі, дзе жылі продкі, але і пакатаць на судне — дакладнай копіі тых, на якіх плавалі калісьці па Заходняй Дзвіне...

Кіраўніцтва мясцовай улады раённага і абласнога ўзроўню, калі вядуцца перагаворы з прадстаўнікамі пасольстваў, інвестарамі, заклікаюць укладваць грошы ў турызм. І ўжо нямала прыкладаў, калі у выніку дзясяткі і сотні тысяч рублёў выдаткоўваюць на аднаўленне, рэканструкцыю сядзіб, у будаўніцтва атэляў і комплексаў для аздараўлення і адпачынку.

Адзін з найбольш перспектыўных кірункаў — пункты для зарадкі электрычных аўто і сэрвіс для аўтатурызму. Гаворка ідзе пра аўтамабільнае падарожжа з пражываннем у кемперах або аўтапрычэпах. Напэўна, кожны, хто быў у краінах Еўропы, бачыў вялікае мноства іх. Перад выхаднымі яны чарадой пакідаюць горад. Кемпер нагадвае маленькі вагончык. Ён, як сапраўдны цягнік, запраўляецца на спецыяльнай станцыі — кемпінгу. Аўтадом трэба «перазарадзіць», таму яму патрабуюцца электрычная разетка, каналізацыйны зліў для біяпрыбіральні, падводка вады са шлангам, магчымасць заліву вады ў бойлер. Нарэшце, зразумела, падарожнікі хочуць прыняць ванну і душ пасля некалькіх дзён у дарозе. І такіх стаянак у Прыдзвінскім краі становіцца ўсё больш. Адпаведная інфармацыя выкладваецца на тэматычны сайт. Медыцынскі турызм таксама з кожным годам становіцца ўсё больш запатрабаваны і папулярны сярод замежных грамадзян. Гэтаму спрыяюць высокая якасць паслуг, якія аказваюцца, і выдатная аснашчанасць медцэнтраў, бальніц і клінік. Вельмі прыцягвае патэнцыйных кліентаў высокая кваліфікацыя медыкаў, якія рэгулярна стажыруюцца ў вядучых клініках свету. Беларускія спецыялісты выкарыстоўваюць прагрэсіўныя методыкі лячэння пры адносна невысокім кошце медыцынскіх паслуг.

Добры бонус — зручнае геаграфічнае становішча вобласці, і ў цэлым краіны. Ды і клімат

Тэлесеткі

ФУРГОН, ДЫ НЕ ТОЙ

На АНТ 3 студзеня чакаецца вялікая прэм'ера — серыял «Зялёны фургон». І назва тая ж, як у знакавага дэтэктыва 1983-га, і Харацьян зноў у галоўнай ролі. Але гэта, папярэджваюць стваральнікі, зусім іншая гісторыя. Зняў яе сёлета рэжысёр Сяргей Круцін як працяг папярэдняга «Зялёнага фургона» — «каб не псаваць добры фільм рэмейкам».

Падзеі 6-серыйнага фільма «Зялёны фургон» (другая яго назва — «Стамбульскі») адбываюцца ў Адэсе праз 20 гадоў пасля вядомых падзей, і зусім сталы экс-франтавік Валодзя Патрыкееў працягвае барацьбу са злачыннасцю. Цяпер ён не наіўны рамантык, а адзінокі воўк з цяжкім лёсам, і справядлівасць для яго набыла зусім іншы сэнс пасля праходжання фронту і лагераў...

Пасляваенную Адэсу здымалі, як ні дзіўна, у Растове-на-Доне і Таганрогу, дзе захавалася нямала будынкаў пачатку XX стагоддзя. Прыкметы сучаснай цывілізацыі хавалі пад вінаграднымі лозамі, расстаўлялі водазаборныя калонкі, а старую зброю і тэхніку знайшлі ў калекцыянераў і ў кінакласцары «Дон». Сярод галоўных герояў гледачы ўбачаць не толькі Дзмітрыя Харацьяна, але і Кацярыну Дураву (дачка вядомага акцёра Льва Дурава), і знаёмых па серыялах Алега Масленікава-Войтава і Аляксандра Давыдава, і ўзыходзячую зорку Сямёна Траскунова, і беларуса Анатоля Ката, адмоўнае абаянне якога прабіваецца скрозь усякі кіношны мундзір.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота з адкрытых крыніц.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 84

Як і ў мінулым выпуску, задача для рашэння ***(гл. дыяграму)*** мае блізня: белую пешку a2 трэба перастаўіць на b3.



— Санаторый знаходзіцца ў гарадской зоне і актыўна працуе з бязвізавымі турыстамі. Сёння гэта ўся Прыбалтыка, Польшча. Калі тры гады таму былі адзінкавыя выпадкі, то цяпер пачаўся рост. Мы асабліва задаволены, што для санаторыяў павялічыўся тэрмін знаходжання — з 10 да 15 дзён. За гэты перыяд можна атрымаць паўнавартасны аб'ём санаторна-курортнага лячэння. Медыцынскім турызмам зацікаўлены ў многіх краінах, і мы можам прапанаваць адпаведную базу. У нас заключаны дагаворы з усімі клінікамі горада, таму наведвальнікі могуць атрымаць шырокае кола паслуг. Апошнім часам павялічваецца колькасць грамадзян Польшчы. Там санаторна-курортнае аздараўленне праходзіць крыху інакш, але, калі яны прыязджаюць, то прыемна здзіўлены і ўзроўнем паслуг, і абслугоўваннем.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

РАСКОШНЫ ПАЛАЦ І ПРЫВАТНЫ ЗААСАД

Рэзерваў для развіцця турызму на Ружаншчыне яшчэ дастаткова

Гаварыць пра развіццё турызму ў Ружанах можна толькі, умоўна кажучы, стоячы каля сцен старадаўняга палаца Сапег. Гэта галоўная славутасць, гонар і сімвал пасёлка. Канцлер ВКЛ Леў Сапега купіў мястэчка ў 1598 годзе і пабудаваў тут замак. І да гэтай пары месцічы, ды і турысты, часта называюць комплекс будынкаў замкам. Але гэта няправільна. Былы замак стаў палацам у XVIII стагоддзі пры Міхаілу Аляксандру з роду Сапег, прадстаўніку галіны роду з гербам «Ліс».

У чаканні 20-тысячнага турыста

Дарэчы, пячатка з названым гербам з'яўляецца адным з найважнейшых экспанатаў музея. Дык вось той самы Аляксандр з гербам «Ліс» запрасіў у Ружаны саксонскага архітэктара Яна Бекера, які стварыў цудоўны палац, архітэктурай нечым падобны на Версаль. Тады ж Ружаны сталі магнацкай рэзідэнцыяй. У палацы размясцілі шыкоўную карцінную галерэю, адну з найбагацейшых бібліятэк Еўропы, у 1765 годзе ўзнік прыдворны тэатр. Каралі і князі, якія стаялі на чале дзяржаў, бывалі гледачамі тэатра.

Войны не пашкадавалі шэдэўр архітэктуры, асабліва ён пацярпеў падчас апошняй. Засталіся толькі муры, ды і яны паступова разбураліся пад уздзеяннем прыроды, а таксама вандальных паводзін людзей. Але ў 2008 годзе палац быў уключаны ў дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі», пачалася яго рэстаўрацыя. З 2011-га тут працуе музей. Прайшло некалькі свят пад назвай «Ружанская брама». З руін узнялася частка паўднёвага корпуса, адноўленыя абодва флігелі і ўязная брама. Рэстаўратары перайшлі на ўсходні корпус. Менавіта ў ім знаходзіўся славуты тэатр. Экскурсаводы звычайна кажуць пра сем планаў куліс, што давалі магчымасць мяняць дэкарацыі падчас спектакля. Два ярусы ложаў нагадвалі падкову, рабілі залу ўмяшчальнай. Аднаўленне ідзе паводле чарцяжоў Бекера, якія захаваліся, але ж пра тэрміны пакуль не кажуць. Вядома, усё залежыць ад фінансавання.

Сёння палацавы комплекс — адзін з найважнейшых турыстычных аб'ектаў краіны, сюды едуць арганізаваныя экскурсіі і адзінкавыя турысты. Музей складаецца з чатырох экспазіцыйных і выставачнай залаў. Працуе сувенірная крама, дзе прадаюцца вырабы майстроў-рамеснікаў з керамікі, ільну, саломкі. Папулярнасцю карыстаецца паслуга музейных работнікаў — урачыстая рэгістрацыя шлюбу ў непаўторнай гістарычнай атмасферы.

Сямейная ўрачыстасць адбываецца ў зале пад назвай «Гасцёўня канцлера» з антуражам эпохі XIX стагоддзя — усё праходзіць надзвычай урачыста.

Дырэктар палацавага комплексу Хрысціна ГЛУШКО кажа, што сёлета палац наведала больш за 19 тысяч турыстаў. Лічба адлюстроўвае работу за 11 месяцаў — да канца года спадзяюцца сустрэць 20-тысячнага наведвальніка.

Меню для вандроўніка

У Ружанах, вядома, гатовыя і да большага патоку людзей. Інфраструктура ў пасёлку нядрэнная. Наведвальнікі могуць падсілкавацца ў кавярні «Ружанка» райспажыўсаюза, наведаць крамы. Для бюджэтных экскурсій, напрыклад, для школьнікаў, магчыма арганізаваць харчаванне і ў сталоўцы сельгаспрадпрыемства «Ружаны Агра». Паесці там можна даволі танна і смачна. Некаторыя турысты наведваюць кавярню ў санаторыі «Ружанскі» — гэта актуальна для тых, хто хоча дадаткова падыхаць гаючым сасновым паветрам і для каго лішнія шэсць кіламетраў не маюць значэння.

Ружанскі палац.

Некалі магнаты выбіралі месца для палацаў з веданнем справы. Цікава, што адлегласць ад Ружан да Пружан, Слоніма, Ваўкавыска, Івацэвіч па старых дарогах аднолькавая — роўна 45 кіламетраў. А Ружаны стаяць на рагу, значыць, на скрыжаванні ўсіх дарог. Акрамя палаца тут можна агледзець царкву і манастыр, касцёл, руіны сінагогі, недалёка — пружанскі «палацык», па суседстве — косаўскі палац Пуслоўскіх і сядзіба Касцюшкі, недалёка надзвычай цікавая вёска Лыскава з рэшткамі храмаў католікаў і місіянераў, іншымі помнікамі даўніны. Здавалася б, у такім месцы павінны нібы грыбы расці аграсядзібы: ёсць чым прывабіць гасцей, што ім паказаць. Але ў Ружанскім сельсавеце, які аб'ядноўвае 32 населеныя пункты, няма ніводнай такой сядзібы. Грамадзяне не праяўляюць ініцыятыву альбо не рашаюцца. Чаму?

Такое пытанне я адрасавала **прадпрымальніку Валерыю ЛАНШАКОВУ.** Валерый Аляксандравіч родам з Забайкалля. Па адукацыі геолаг. Працаваў па спецыяльнасці, потым паехаў на БАМ, як і многія людзі яго пакалення. Там пазнаёміўся з Наталляй Яўгенаўнай, стварылі сям'ю. Пасля развалу Саюза паспрабавалі сябе ў прадпрымальніцтве. «Але ў 90-х там было проста страшна гэтым займацца, — згадвае Валерый Ланшакоў, — рэкет на мяжы з разбоем, крадзяжы і іншае... Адным словам, мы прыехалі ў Беларусь, на радзіму жонкі, тут было ціха, спакойна. Жыццё на парадак таннейшае. Праўда, цяпер многае змянілася, але мы ўжо пусцілі карані. Нікуды не збіраемся».

Калі хобі становіцца бізнесам

Валерый з Наталляй адкрылі ў Ружанах прадуктовую краму. Не так даўно вытрымалі нават канкурэнцыю буйных гандлёвых сетак, якія з'явіліся ў Ружанах. Паводле ацэнкі прадпрымальнікаў, бізнес хоць сціплы, але стабільны — пакуль, а што далей будзе, цяжка прагназаваць. Таму трэба думаць, у які бок развівацца. Магчымым кірункам вызначылі аб'ект, разлічаны менавіта на турыстаў.

А пачалося, можна сказаць, выпадкова. Валерый Аляксандравіч даўні аматар жывёл і птушак. Спачатку на сваім падворку разводзіў курачак, фазанаў, паўлінаў, індыкоў. Раз, другі напрасіліся школьнікі паглядзець гэты жывы куток. А дарослыя сталі пытаць: чаму, маўляў, не арганізоўваеце экскурсіі? Але ж не паказваць людзям дзясятак насельнікаў жывога кутка. Так паступова зарадзілася ідэя пашыраць заасад, набываць новых жывёлін, праводзіць экскурсіі. На аўкцыёне купілі будынак былой школы ў вёсцы Малочкі, што зусім побач з Ружанамі. У ваколіцы пабудавалі вальеры. Цяпер тут жывуць яноты, лісы, іншыя драпежнікі, алені, лані, самае рознае птаства. Вавёркі карцінна грызуць арэшкі за сеткай, алені паслухмяна бягуць на покліч гаспадара. Адразу кідаецца ў вочы, што жывёліны дагледжаныя, поўсць аж блішчыць.

— Справа гэта, вядома, затратная. Аднаго мяса драпежнікам трэба кожны месяц на 130—150 рублёў, а яшчэ збожжа, кукуруза, прэпараты для прафілактыкі хвароб, — расказвае гаспадар. — Калі падлічваем расходы, разумеем, што рызыкуем. Але, думаю, варта паспрабаваць. Былую школу мы рамантуем, каб адкрыць невялікую кавярню, можа яшчэ што прыдумаем для турыстаў, каб людзі маглі адпачыць на прыродзе. Адчуваю, што нашы паслугі будуць запатрабаваныя. Вось і гэтым летам былі адпачывальніцы з санаторыя, жыхаркі вялікіх гарадоў. Адна жанчына села на лаўку, нават не пайшла глядзець жывёлін, сказала, што хоча паслухаць птушак. Мяне здзівіла, у ваколіцах санаторыя «Ружанскі» гаючае паветра, прыроды як быццам бы хапае. Але там сасновы лес, там няма столькі птушак, патлумачыла яна. А ў нас і праўда, у канцы вясны гучаць сапраўдныя птушыныя сімфоніі. І, на шчасце, ёсць людзі, якія ўмеюць гэта чуць і разумець.

Валерый ЛАНШАКОЎ.

Цяжкасці і перашкоды

— Калі б мне далі льготны крэдыт, я даўно б усё тут уладкаваў, напрыклад, асфальт паклаў бы на стаянку, дах узводзіць закончыў. Але крэдыт не ўдалося атрымаць, таму разлічваем толькі на свае сілы, робім усё паступова, — падсумоўвае гаспадар.

— Пры разліку падатку на зямлю нам прымянілі каэфіцыент 2, — працягвае Наталля Яўгенаўна, — і гэта вельмі адчувальна для фінансаў. Будзем звяртацца ў райвыканкам; прасіць, каб знізілі.

Многа цяжкасцяў узнікае не толькі фінансавага, але і фармальнага характару. Ланшаковы працуюць з жывёлай, кожнага звера рэгіструюць ва ўстаноўленым законам парадку. Але іх папярэдзілі аб магчымых праверках адразу чатырох інспекцый па ахове жывёльнага і раслінnага свету: Слонімскай, Ваўкавыскай, Бярозаўскай і Брэсцкай абласной. Сапраўды, ці не многа?

Валерый Ланшакоў — чалавек дыпламатычнага складу характару, ён не робіць рэзкіх высноў, але ж лічыць, што для развіцця аграэкатурызму патрэбная падтрымка з боку ўлады як рэальная грашова-крэдытная, так і маральная. Паводле яго звестак, у суседняй вёсцы ёсць гаспадары па прозвішчы Баранавы, якія хацелі заняцца развядзеннем коз, зрабіць аграсядзібу з гастранамічным кірункам, рэкламаваць карысць казінага малака і сыру, але крэдыт не атрымалі і абмежаваліся развядзеннем коз для сябе.

Старшыня Ружанскага сельскага Савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ, якая год працуе на гэтай пасадзе, сказала, што мінулы год прайшоў у клопатах па добраўпарадкаванні пасёлка ў сувязі з дажынкамі, а цяпер мясцовая ўлада мае намер больш працаваць з жыхарамі, каб абудзіць іх дзелавую актыўнасць, у тым ліку і па адкрыцці аграэкасядзіб: «У нас прыгожыя мясціны, нямала славутасцяў, ёсць чым прывабіць турыста».

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Пружанскі раён.

❍ Толькі лічбы

КРЫНІЦА ДАХОДУ

Каля 250 мільёнаў долараў можа зарабіць Беларусь на экспарце турыстычных паслуг па выніках 2019 года.

Пра гэта ў прэс-цэнтры БелТА паведаміў **намеснік дырэктара — начальнік аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталь ГРЫЦЭВІЧ.**

«Экспарт турыстычных паслуг за студзень—кастрычнік склаў 218,8 мільёна рублёў, тэмп росту — амаль 115 %. Мы прагназуем, што да канца года экспарт будзе каля 250 мільёнаў долараў, тэндэнцыі паказваюць на тое, што дасягнем гэтай лічбы, — адзначыў Віталь Грыцэвіч. — наша заданне на гэты год было 240 мільёнаў».

Па звестках Дзяржпагранкамітэта, за студзень—лістапад у Беларусь уехала каля 4,5 мільёна чалавек. «Мяркую, да канца года мы наблізімся да пяцімільённай адзнакі. З улікам беларуска-расійскага ўчастка мяжы агульная лічба летась склала 11,5 мільёна чалавек. Лічбы Дзяржпагранкамітэта сведчаць пра тое, што гэты паказчык у 2019 годзе павялічыцца», — дадаў прадстаўнік Мінспорту.

Закранаючы тэму бязвізавага рэжыму, Віталь Грыцэвіч адзначыў, што Міністэрства спорту і турызму падтрымлівае распаўсюджванне бязвізавага рэжыму на ўсе міжнародныя пункты пропуску, у тым ліку наземныя.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, офис 5
Продавец	ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30)

Предмет аукциона

Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО» (регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 4 января 2019 г.).
Состав имущества и имущественных прав см. на сайте www.cpo.by

Месторасположение производственной базы **– Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**

Начальная стоимость без НДС – 96 448,13 бел. руб. (снижена на 40 %). Шаг аукциона без НДС – 4 822,41 бел. руб.

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30

Задаток 3 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.10.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 16.01.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются по 14.01.2020** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: ОАО «МИНСКИЙ ЛАКОКРАСОЧНЫЙ ЗАВОД» (УНП 100645846), г. Минск, ул. Бирюзова, 4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.
Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **13 января 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.
Предмет торгов – **капитальное строение с инв. № 500/С-1021204 (подъездной железнодорожный путь), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002237, г. Минск, ул. Бирюзова, 4.** Начальная цена – 58 539,65 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.
Для участия в торгах необходимо в срок по 10.01.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 09.11.2019 г.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: СООО «Никольстиль» (УНП 290308009) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130 85 30.
Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **17 января 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Шаг торгов/ задаток, бел. руб.
1	Административно-производственное здание (инв. № 100/С-72206), г. Брест, ул. Гоздецкого, 10, в составе с движимым имуществом (подробнее на beltorgi.by)	1 156 009,32	57 800,47
2	Предприятие как имущественный комплекс ООО «Никольстиль» регистрационным номером 0001412, г. Брест, ул. Гоздецкого, 10	2 934 900,00	146 745,00

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 18.
Для участия в торгах необходимо в срок по 16.01.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 19.11.2019 г.

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1815258, 1815259, 1760125, 1798406, 1798465, 1805669, 1805746, 1805842, 1805897, 1736738, 1774350, 1774513, 1810721, 1787661, 1720783, 1720784.

УНП 100782388

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона и оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Продавец	Частное предприятие «Эдэн-Н», г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143Б/2, пом. 14, каб. 600/7
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Местоположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 178Б

Наименование (назначение)	Об. пл.	Инвентарный номер
Здание административно-хозяйственное	526,1 кв. м	500/С-27625

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу пл. **0,0698 га** на праве аренды (срок действия по 31.03.2027) для эксплуатации и обслуживания административно-хозяйственного здания по пр-ту Партизанскому, 178. Ограничения (обременения) – находится в водоохранных зонах

Начальная стоимость без НДС – 915 414,00 долларов США

Задаток 10 % по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

*Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 1 (один) % от цены продажи лота в течение после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов – 29.01.2020 в 11.00.** **Окончание торгов – 29.01.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.01.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: **auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ПРОМСВЯЗЬ»

Лот № 1, состав: 1. Здание производственного корпуса с инв. № 600/С-73691, пл. – 471,5 кв. м. 2. Склад горючего с инв. № 600/С-117572, пл. – 13,1 кв. м. 3. Здание гаража с инв. № 600/С-73698, пл. – 58,5 кв. м. 4. Здание дизельной с инв. № 600/С-73686, пл. – 55,0 кв. м. 5. Многолетние насаждения: лиственница – 2 шт., береза бородавчатая – 13 шт., клен остролистый – 2 шт., ясень пенсильванский – 1 шт., дуб черешчатый – 3 шт., ива козья – 2 шт., каштан конский – 1 шт., малина – 15 шт., газон – 5 шт. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Щомыслица.
Земельный участок с кадастровым номером 623688000001000033 площадью 0,7828 га. Целевое назначение – обслуживание зданий и сооружений производственной базы. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Обременение: покупатель обязан обеспечить свободный проезд и (или) проход к земельным участкам 623688000001001098 и 623688009101000905.
Начальная цена с НДС – 158 190,00 бел. руб. **Задаток** – 8000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.
Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 20 000,00 бел. руб.

Условия аукциона: 1. Подписать договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. 2. Оплатить приобретенный на аукционе Объект путем перечисления денежных средств на расчетный счет Организатора аукциона в течение 90 (девяноста) дней со дня подписания договора купли-продажи Объекта. Переход права собственности на Объект осуществляется после полной оплаты стоимости Объекта. 3. Возместить расходы Продавцу: – по уплате земельного налога за период с момента передачи Объекта и до момента оформления прав на земельный участок; – по переоформлению правоустанавливающих документов на Объект и земельный участок. 4. Покупатель самостоятельно осуществляет подготовку и предоставление необходимого пакета документов для государственной регистрации договора купли-продажи Объекта, перехода права собственности на Объект в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»

Аукцион состоится 28.01.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «ПРОМСВЯЗЬ», г. Минск, ул. П. Бровки, 18.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе ОАО «ПРОМСВЯЗЬ» 28.01.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 24.01.2020 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Петровский Александр Иванович, тел.: 8 (017) 292-72-33, 8 (029) 700-13-90.

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • **www.ino.by** • e-mail: **torgi@ino.by**

Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 28 января 2020 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб.	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.
1.	Земельный участок У-615*	Микрорайон «Заболоть»	0,1011	440100000002007224	12,75	17 333,91	3 500

* - Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» и решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 28 января 2020 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования. Дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 30 декабря 2019 года по 22 января 2020 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальные сайты организатора торгов: www.grodno.gov.by, gcn.by

БЕЗ ЖАЛЕЗА І ІНШЫХ ПРЫМЕСЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Асноўны крытэрый для выбару населеных пунктаў, дзе будуць будавацца станцыі абезжалезвання, — перавышэнне ўтрымання жалеза ў вадзе, а таксама колькасць жыхароў, — праінфармавала спецыяліст. — На сёння больш за 92 % насельніцтва забяспечана якаснай вадой. Да 2025 года гэта лічба складзе 100 %.

Паводле яе слоў, больш за палову з 250 запланаваных сёлета да будаўніцтва станцый ужо ўведзена ў строй. Прыблізна для сотні аб'ектаў завяршаецца падрыхтоўка дакументацыі.

— Амаль усе запланаваныя станцыі будуць уведзены ў строй. Тыя, што не паспеем, увядзём у пачатку 2020 года. Да 2025 года штогод у кожнай вобласці будзе будавацца не менш за 40 станцый абезжалезвання. Таксама вядзецца работа па перападключэнні населеных пунктаў і падвозе вады туды, дзе будаўніцтва станцый абезжалезвання з'яўляецца неэфектыўным, — паведаміла Ірына Салівончык.

Айчынная распрацоўка

Прычым вырабіць неабходную для краіны колькасць станцый, якія не будуць саступаць імпартным аналагам, можна ў Беларусі. Напрыклад, Нацыянальная акадэмія навук распрацавала прадукт, які будзе вырабляцца на базе аршанскага «Завода ПАК». Праект рэалізуецца ў межах праграмы развіцця Аршанскага раёна да 2023 года.

— Распрацавана канструктарская дакументацыя, створаны вопытны ўзор, які працуе на працягу дзевяці месяцаў. Холдынг «БелАЗ» на базе «Завода ПАК» ажыццяўляе падрыхтоўку вытворчасці і ў хуткім часе выпусціць першую партыю. У далейшым гэтыя станцыі па ачыстцы пітной падземнай вады з'явяцца ў населеных пунктах. Наша станцыя не даражэйшая за імпартную, і гэта дазваляе ёй перамагаць у конкурсах на пастаўку, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і вытворчасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр КАЗЛОЎ.**

Больш падрабязна пра гэта расказаў **кіраўнік праекта «Водаачыстка і водаадвядзенне», начальнік вопытнай вытворчасці НПЦ НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве Аляксей ШАЛКОЎСКІ.**

— Наша станцыя прызначана для невялікіх населеных пунктаў, дзе жыве да дзвюх тысяч чалавек. Акрамя жалеза, у вадзе могуць прысутнічаць і іншыя прымесі. Напрыклад, на 5 % аб'ектаў утрымліваецца марганец. Ведаючы набор прымесяў, мы стварылі ўніверсальную станцыю для выкарыстання на аб'ектах з прапускной здольнасцю да 240 м³ пітной вады ў суткі. З метадаў ачысткі вады ад жалеза, якія існуюць у нашай краіне, мы выкарыстоўваем акісленне кіслародам паветра — аэрацыю. Вопытны ўзор станцыі працуе ў Заслаўі, у Цэнтральным раёне. І водгукі станоўчыя — жалеза ў пробах вады не выяўляецца, яна адпавядае нормам СанПіН. Мы паставілі яшчэ тры падобныя станцыі: у Ляхавічах такая запушчана і функцыянуе, у Ганцавічах і Аршанскім раёне рыхтуюцца да запуску. Мы працуем сумесна з «Заводам ПАК», навучаем яго спецыялістаў зборцы і далейшай эксплуатацыі.

> “Асноўная праблема нашай вады — павышанае ўтрыманне жалеза. Яно не аказвае таксічнага дзеяння на арганізм, аднак спрыяе павелічэнню мутнасці, афарбаванасці і з'яўленню спецыфічнага паху.

Аляксей Шалкоўскі адзначыў, што Нацыянальная акадэмія навук распрацоўвае абсталяванне і рэагенты для ачысткі сцёкавых вод.

— Пітную ваду, што здабываецца з зямлі, мы ачышчаем без праблем. А вось ачысціць тое, што сыходзіць у зямлю — сцёкі, — вялікая праблема. Асабліва з рэагентнай базай, якая выкарыстоўваецца для ачысткі вады. Штогод на абсталяванне і імпартныя рэагенты даводзіцца выдаткоўваць каля 300 мільёнаў долараў. У свеце пастаянна змяняюцца тэхналогіі, бо мяняецца і састаў прымесяў у сцёках. У Акадэміі навук існуе свая школа з вопытам такой работы, і мы гатовы працаваць у гэтым кірунку.

Небяспечныя калодзежы

Што датычыцца якасці вады, якую атрымліваюць беларусы, то яна даволі высокая. У адпаведнасці з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, вада лічыцца бяспечнай, калі колькасць нестандартных проб не перавышае 5 %.

— Ужо на працягу многіх гадоў у Беларусі доля нестандартных проб па хіміка-біялагічных паказчыках не перавышае 1 %, што сведчыць аб высокай эпідэміялагічнай надзейнасці вады, якую атрымлівае насельніцтва, — кажа **загадчык аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр СПУРГЯШ.**

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Асноўнымі крыніцамі водазабеспячэння ў Беларусі, акрамя Мінска, з'яўляюцца падземныя воды. У сталіцы некаторыя раёны (у прыватнасці, Маскоўскі і Фрунзенскі) ужываюць ваду з паверхневых крыніц. Перавесці ўсё раёны Мінска на падземныя крыніцы водазабеспячэння плануецца да 2025 года. Праектная дакументацыя ўжо распрацаваная, цяпер ажыццяўляецца выбар генпадрадчыка.

— Асноўная праблема нашай вады — павышанае ўтрыманне жалеза. Яно не аказвае таксічнага дзеяння на арганізм, аднак спрыяе павелічэнню мутнасці, афарбаванасці і з'яўленню спецыфічнага паху, што абмяжоўвае выкарыстанне гэтай вады ў санітарна-бытавых мэтах. Па выніках лабараторнага кантролю, калі браць статыстыку за апошнія 15 гадоў, колькасць нестандартных проб па санітарна-гігіенічных паказчыках (а яны ў асноўным звязаны з высокім утрыманнем жалеза) зменшылася з 22,5 % да 15 %, — расказвае Аляксандр Спургяш.

У малых населеных пунктах выкарыстоўваюцца нецэнтралізаваныя крыніцы водазабеспячэння — гэта шахтавыя і трубчастыя калодзежы. Паводле слоў спецыяліста, яны з'яўляюцца недастаткова бяспечнымі, бо ў іх трапляе вада з найбліжэйшага да паверхні зямлі ваданоснага слою, які не абаронены воданепранікальнымі пародамі. У асноўным нестандартныя пробы па санітарна-гігіенічных паказчыках у такіх калодзежах звязаны з павышаным утрыманнем нітратаў.

— У апошнія гады колькасць нецэнтралізаваных крыніц, якія не адпавядаюць установленым патрабаванням, знізілася з 15 % (у 2008 годзе) да 4 %. Наколькі бяспечная вада ў такіх калодзежах, уладальнікі могуць даведацца, здаўшы яе на даследаванне. Як гэта зрабіць, можна ўдакладніць у тэрытарыяльных цэнтрах гігіены і эпідэміялогіі, — праінфармаваў Аляксандр Спургяш.

Паводле звестак ААН, больш за два мільярды людзей на планеце жывуць без доступу да бяспечнай вады ў хатніх умовах. Пры гэтым 80 % людзей свету, якім даводзіцца выкарыстоўваць ваду з небяспечных ці неабароненых крыніц, жыве ў сельскай мясцовасці. Больш за 40 % насельніцтва планеты пакутуе ад нястачы вады, і гэтая лічба будзе расці. Доля прэснай вады на планеце, па розных падліках, складае ўсяго 2,5–3 % ад усёй вады. Да 2025 года амаль палова жыхароў планеты рызыкуе жыць ва ўмовах хранічнай ці перыядычнай нястачы прэснай вады.

Як сэканоміць 15 тысяч еўра?

Дапамагаюць атрымаць доступ да якаснай пітной вады і некаторыя праекты, якія рэалізуюцца ў нашай краіне, у тым ліку ў партнёрстве ПРААН з Міністэрствам прыроды. Дзякуючы аднаму з іх — «Зялёная эканоміка» — дзевяць тысяч сельскіх жыхароў Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, у тым ліку 735 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, атрымалі бесперабойны доступ да пітной вады. Помпавае абсталяванне водазабораў было заменена на больш энергаэфектыўнае, у тым ліку помпы, лічыльнікі вады і электрычнасці для дыстанцыйнага зняцця паказанняў. На 18 найбольш аддаленых сельскіх водазаборах было ўстаноўлена абсталяванне для дыстанцыйнага кіравання артэзіянскімі свідравінамі. Інфармацыя з водазабораў цяпер паступае на спецыяльна абсталяваны цэнтральны дыспетчарскі пункт у Мастах. Аўтаматызацыя дазволіла забяспечыць 31 сельскі населены пункт бесперабойным круглагадовым пітным водазабеспячэннем, а гэта 60 % сельскага насельніцтва Мастоўскага раёна.

Створаная ў раёне сістэма мае эканамічны і экалагічны эфект, паведаміла **супрацоўнік па камунікацыях ПРААН Кацярына ЯКУБЕНКА.** Яна дазваляе скарачаць энергазатраты на здабычу і дастаўку на 15 тысяч еўра штогод. Пры гэтым змяншэнне страт вады складае 5 % за кошт аператыўнага выяўлення аварый у трубаправодах.

Алена КРАВЕЦ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2019 года.